Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

ДУМКА ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12 m. 6). Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрасу 30 гр.

Нязрыкаваныя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаваных залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош, сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок петыту ў 1 шпальту.

№ 1 — Вільня, Серада 4-га студзеня 1928 г. — Год I

У гэтым нумары 6 страніц.

Таварыства Беларускае школы.

Магутны ўздым сьвядомасьці беларускіх працоўных гушчаў за апошнія гады, узбуджаньне актывізацыі і самадзеяльнасьці гэтых гушчаў скіраваліся ня толькі на барацьбу за свой штодзённы хлеб, за сваё існаваньне і палепшаньне быту, а таксама і на барацьбу за сваю культуру, за правa яе на разьвіцьцё.

Беларуская культура, пачаўшая сваё існаваньне чуць не на нашых вачох, як *культура працы*, выяўляючая тую-ж самую барацьбу беларускіх працоўных гушчаў за сваё месца над сонцам,— надставу свайго існаваньня і далейшага разьвіцьця—мае бязумоўна ў далейшым разьвіцьці самасьвядомасьці і самадзеяльнасьці тых-жа *людзей працы*, з якімі яна арганічна зьвязана.

Гэтую сувязь беларускае культуры з жыцьцём працоўных гушчаў проста інстынктыўна зразумелі самі-ж гушчы, *творачы самі* арганізаваную надставу культуры—Таварыства Беларускае Школы. Пачаўшы сваё існаваньне ня так даўно, Т-ва Белар. Шк., дзякуючы зразуменьню працоўнымі яго заданьняў, цяпер ужо разраслося ў магутную і стройна арганізаваную сілу, якая будучы спыняная ў імкненьнях да здабыцьця роднае школы, давала прастор для выяўленьня энэргіі працоўных гушчаў у тым кірунку, у якім гэта аставалася магчымым. У часы „залому" беларускага палітычнага арганізаванага жыцьця — Т-ва спакойна вядзе сваю працу над паднімцьцем культурнага зроўня сялян і работнікаў, дае магчымасьць выліць ім тую сілу, паўнату якое нельга было выліць інакш.

Варожыя беларускім працоўным гушчам сілы, баючыся зрабіць сусьветны скандал, каб адкрытым наскокам развяліць працу Т-ва — натварылі розныя „Прасьветы", „Культуры", „Інстытуты Гаспадаркі", якія драбязковасьцю сваіх мэтаў, зацямненьнем запраўднай сутнасьці культуры—імкнуцца адцягнуць увагу працоўных гушчаў ад разуменьня гэтае сутнасьці, разьбіць яе на дробязі і скіраваць у бок такі, які гэта жадаецца „панам палажэньня".

Але дарма. Беларускія працоўныя гушчы самі стварылі сваю арганізацыю, самі надалі ёй той характар, які яна мае цяпер — самі-ж і будуць яе вясьці далей, з пагардай адкідаючы „ласкавы хлеб" буржуазных агентураў.

Не зварачваючы ўвагі на панскія крамкі навет з беларускімі вывескамі, Т-ва Беларускае Школы спакойна і сыстэматычна вядзе далей сваю карысную працу над разьвіцьцём сьвядомасьці і самадзеяльнасьці—працоўных масаў. І ў часы распачацьця выбарнай гарачкі Т-ва Беларускае Школы вуснамі дэлегатаў з самых далёкіх куткоў нашай краіны на зьезьдзе 28 і 29 сьнежня кліча беларускія працоўныя гушчы не забывацца, што выбарны час не павінен адцягаць нашае ўвагі таксама ад тае штодзённае барацьбы за сваю культуру, за яе права. Пройдзе гэты выбарны чад, але барацьба за культуру, як і барацьба за свае інтарэсы і быт наагул — будзе вясьціся і далей. Вызваленьне не настане з выбарамі. Дык няхай-жа энэргія, зрушаная і незапакоеная выбарнай завірухай, пойдзе ня толькі на правядзеньне сваіх прадстаўнікоў у Сойм, ня толькі на выяўленьне сваей волі мець гэтых прадстаўнікоў, ня толькі на падлічэньне сваіх сілаў, а таксама і на замацаваньне тых пазыцыяў, якія мы маем. Падвоеная энэргія няхай прынясе падвойныя вынікі і на гэтым полі. Няхай падвояцца і рады Т-ва Беларускай Школы.

Міжнародныя адносіны у 1927 г.

У цэнтры эўрапэйскіх падзей у 1927 г.—дый ня толькі, як галоўная праблема адбудаваньня трывалага ладу і міру ў сьвеце, але ўсё больш і як актыўны чыньнік-кіраўнік усіх высілкаў, скіраваных да агульнай гэтай мэты, стаяла як і ў 1926 г., — Нямеччына.

Найвялікшы, найбольш актыўна-творчы духоўна-гаспадарчы арганізм, лежучы ў цэнтры Эўропы, лягчэй, як усе іншыя перанесшы страшэнныя ўдары і ахвяры вайны дый яшчэ цяжэйшыя кары „міру", быў толькі абязброены ды зьвязаны, але зусім не зруйнаваны ваенна-палітычнай перамогай саюзьнікаў, якія больш можа нацярпелі ад сваей „перамогі", як Нямеччына ад свайго паражэньня... Дык ясна, што і ў 1927 г. ішло ўсьцяж далейшае Вызваленьне Нямеччыны з тых путаў і вязаў, якімі яе зьвязаў Вэрсальскі Трактат, недарэчна маніўшыся вычыркнуць з жыцьця Эўропы найбольш актыўны чыньнік яе духоўнага і гаспадарчага разьвіцьця.

У 1927 г. Нямеччына прадаўжала сыстэматычнай палітыкай спыняць ненавісьць і недаверие да сябе ў сваіх нядаўніх ваенных ворагаў, пeратвараючы іх у гаспадарчых, а пасьля і палітычных саюзьнікаў. 1924—1925 г. Нямеччына „заваявала мірна" Англію, якая робіцца ад таго часу яе „саюзьнікам", часта проці былых сяброў саюзьнікаў па вайне.

У 1925—1926 нямецкая палітыка шляхам фінансава-эканамічнай дапамогі Францыі, шляхом аб'яднаньня ў магутныя трэсты розных галінаў нямецкай і францускай прамысловасьці—і шляхом паразуменьня больш дэмакратычных партыяў абодвух дзяржаў—рашуча пераламывае прынцыповую варожасьць Францыі...

Гэтым мастацкім крокам—сваіх палітыкаў Нямеччына адразу вызваляецца ад прыязнай апекі і палітычнага кіраўніцтва Англіі, а—наадварот — сама становіцца паміж гэтымі галоўнымі, кіруючымі дзяржавамі Эўропы, дый, карыстаючыся існуючымі паміж імі супярэчнасьцямі інтарэсаў, сама робіцца самастойным, усё часьцей і рашучай—кіруючым чыньнікам эўрапэйскай палітыкі...

1927 пачынаецца далейшым чарговым нямецкай дыплёматыі на тым-жа шляху — паразуменьнем, зьліквідаваньнем значна завастрыўшыхся ў папярэднім годзе стасункаў з Італіяй.

Як прымірэньнем з Францыяй Нямеччына вызвалялася з-пад дабрадзейнай, але зьвязваўшай свабоду яе руху, апекі Англіі, таксама сваім паразуменьнем з Італіяй Нямеччына ў значнай меры вызвалялася з-пад усьцяж трываўшай „ваенна-кантрольнай" дый цяжкай акупацыйнай „рукі" Францыі.

Францыя найлепш зразумела ды адчула зьмест гэтага кроку нямецкай дыплёматыі: замест таго, каб Францыя панавала над страшэнна пасварыўшыміся Італіяй і Нямеччынай, да чаго ўсьцяж імкнулася француская палітыка, цяпер Нямеччына зьяўляецца „судзьдзей" паміж Францыяй і Італіяй, між якімі—пэўне ж не бяз спрытнага ўмяшацельства ня толькі англійскай, але і нямецкай дыплёматыі—пачалі страшэнна завастрацца.

Гэткім чынам ясна, што Нямеччына — ад самага Рапальскага Трактату з Радамі ў 1922 г.—вядзе пляновую палітыку вызваленьня сваей самастойнасьці, канкуруючы гэтымі ўсвайкаванымі ад англійскай дыплёматыі спосабамі з самой Англіяй...

Рэзультаты такой пасьпешнай дыплёматыі выявіліся. Гэткім чынам—з усімі дзяржавамі Эўропы Нямеччына к 1927 г. ужо наладзіла больш-менш дзелавыя, калі ня добрыя адносіны, ня гледзячы на існуючыя ўсьцяж „скарпіёны" для яе — ў Вэрсальскім Трактаце. З усімі—апрача Польшчы...

І з гэтага таксама відаць ясную мэту нямецкай дыплёматыі: згуртаваць усе сілы эўрапэйскіх дзяржаваў дзеля націску на Польшчу—ў напрамку зьдзейсьненьня нямецкіх дамаганьняў коштам Польшчы, разьбіваючы тым самым тое кола саюзаў і гарантыяў, якое стварыла француская і польская дыплёматыя навакол Польшчы...

Вынікі гэтай спрытнай палітыкі выявіліся выразна і ў 1927 г. І лютага быў спынены ваенны кантроль саюзьнікаў—фактычна—Францыі...—над Нямеччынай, — пасьля ўрачыстага прызнаньня, што Нямеччына выпаўніла ўсе дамаганьні Трактату ў справе разбраеньня. Справа вырашана—проці волі Францыі і яе васалаў — пад рашучым націскам Англіі, а яшчэ больш—новага прыяцеля Нямеччыны і новага ворага Францыі — Італіі... Францыі і Польшчы зроблена была толькі нязначная ўступка: Нямеччына абавязалася зьбурыць каля трэцяй часткі менш важных укрэпленьняў, пабудаваных ёй на яе польскай граніцы...

Палітычная вага Нямеччыны расьце яшчэ і дзеля таго, што „разброеная дарэшты", ня маючая ані флёту ані войска (100 тысячная армія дазволена Трактатам — для ўтрыманьня парадку ўнутры краю), Нямеччына зьяўляецца першай дзяржавай па сіле свайго паветранага флёту і аэраплянавай прамысловасьці, а таксама і па сіле сваей хімічнай прамысловасьці. А ведама, што ў прышлай вайне—будуць іграць першую ды рашучую ролю—не браняносцы ды гарматы ці вялізарныя масы „гарматняга мяса", але —аэрапляны ды „хімічныя спосабы" зьнішчэньня арміяў на фронце, а перадусім — цэлых местаў у тылу...

Адносіны Нямеччыны да Польшчы ў 1927 г. былі, так сказаць, „спакойна варожыя". Ня толькі кіраўнік усіх нямецкіх партыяў, але і адказныя кіраўнікі нямецкай дзяржавы—усё больш выразна і рашуча заяўлялі, што Нямеччына нікoлі ня прызнае сучасных польска-нямецкіх граніцаў, але наадварот—перагляд гэтых граніцаў ставіць галоўнай мэтай сваей палітыкі. Гэтыя палітычныя прычыны найбольш прычыніліся да ўтрыманьня аж да канца году стану гаспадарчай вайны паміж Польшчай і Нямеччынай, якая цягнецца ўжо некалькі гадоў.

Толькі ў канцы году пачалося—пад рашучым націскам Англіі—пэўнае паразуменьне паміж Нямеччынай і Польшчай, якое пакуль-што неяк ня выявілася ў скольki небудзь канкрэтных формах. Англія, якая сьпярша рашуча падтрымлівала Нямеччыну ў яе імкненьні да „перагляду граніцаў з Польшчай", у 1927 г. усё больш схілялася на бок Польшчы, зрабіўшы для яе „стабілізацыі" ня менш, як датаго—Францыя.

Англія, фармальна адмовіўшыся ў Лёкарно цалком загарантаваць польскія граніцы, фактычна дала Польшчы новыя сілы дзеля абароны яе становішча проці Нямеччыны. Мы кажам, зразумела,—аб тэй міжнародавай пазыцыі, якую атрымала Польшча—дзякуючы перадусім англійскай дыплёматычнай дапамозе—фінансава-гаспадарчая „стабілізацыя" Польшчы значна ўкрапіла і яе міжнародавае палітычнае становішча ў сьвеце.

Зьмена становішча Англіі адносна да Польшчы тлумачыцца, як ведама, — нанова распачаўшымся, дый асабліва завастрыўшымся ў 1927 г. канфліктам яе з СССР.

Але тут мы ўжо выходзім з вузкага кола эўрапэйскіх падзей і ўваходзім у шырокі прастор сусьветнай палітыкі.

У 1927 г. прадаўжалася, дайшла, ужо, здавалася, да свайго памысьнага канца вялізарная барацьба 430 ці мільённага Кітайскага народу да свайго сацыяльнага і нацыянальнага вызваленьня з-пад улады чужаземнага імпэрыялізму, і закончылася, прынамсь — на якісь — пэўна-ж даўжэйшы час — пэўным разгромам народна-вызваленчых арміяў, а перамогай чужынцаў...

Кітайская барацьба згуртавала навакол сябе ўвагу ўсяго сьвету, а перадусім—усяе Азіі дый усяго „каляніяльнага", паняволенага Эўрапэйскім і Амэрыканскім імпэрыялізмам, — 4 каляровага чалавецтва...

У 1927 г. якраз разыйгралася ў Кітаі генаральная бітва паміж двума волатамі навадырамі дзьвюх вялізарных сусьветных арміяў працы і капіталу — СССР і Англіяй.

Сьпярша барацьба, спрытна кіраваная Радамі, навучыўшымі кітайскіх павадыроў зьвязаць мамэнт нацыянальнага вызваленьня з лёзунгам вызваленьня сацыяльнага, дый—з усіх ворагаў імпэрыялістаў выбраць адна-го—галоўнага, не чапаючы, а тым самым робячы сабе саюзьнікамі — усіх іншых, — сьпярша гэтая барацьба йшла проста з цудоўным пасьпехам. Адзін па адным усе цэнтры, дзе ўмацаваліся замежныя імпэрыялісты, былі ўзяты народнымі арміямі. Астаўся толькі Пэкін, дзе ўмацаваўся верны найміт Японіі—Чанг-Тсо-Лін. Здавалася, ужо прабіла і іх абодвух. Англійцы масамі ўцякалі з Кітаю; англійскі ўрад рабіў новаму Кітаю найлепшыя прапазіцыі...

Але — павадыры кітайскага народу не аказаліся на вышыні гістарычнага заданьня, ані годнымі ахвярнага ўздыму народу.—Павадыры прадалі народную справу лютым ворагам Кітаю — англійцам... У выніку гэтай здрады, купленай англійскімі грошамі, а таксама спрытнай тактыцы англійскай дыплёматыі, якая здолела згуртаваць проці кітайскай рэвалюцыі і ўплывам СССР — усе канкураваўшыя датаго ў Кітаі імпэрыялістычныя дзяржавы, якія, з фашыстаўскай Італіяй на чале, пачалі—прыкрываную знанымі фразамі „аб неабходнасьці абароны сваіх грамадзян і іх маемасьці"—фармальную ваенную інтэрвэнцыю, ці папросту паход проці Кітаю.

Заламаўшаяся ў пачатку году перамога кітайскага народу ў канцы года ператварылася — у ваенна-паліцэйскае ліквідаваньне настрашанымі буржуазнымі клясамі ў саюзе з чужаземнымі імпэрыялістамі — ня толькі ўсіх дасягненьняў вялізарнага народнага руху, але і фізычным зьнішчэньнем усіх актыўных—рэвалюцыйных, паўстанчых элемэнтаў краю.

У выніку гэтай перамогі Англіі ў Кітаі ў канцы году ўсе радавыя пляцоўкі ў Кітаі аказаліся ў такім самым палажэньні, у якім у пачатку году былі англійскія: англійскія агітатары нацкоўваюць народ на радавых агентаў—дыплёматычных, тарговых і інш., на ўсіх грамадзян СССР, на ўсіх, каго назавуць „камуністам"... У выніку гэтага па ўсяму Кітаю цяпер ідуць страшэнныя гвалты — рабункі, арышты ды забіўствы радавых грамадзян і „камуністаў",—чаму кітайскія ўлады ня робяць ніякіх перашкодаў... Гэта ўжо выклікала востры канфлікт з Кітаем і СССР, які пагражае прыняць актыўна-ваенную форму... Чычэрын выслаў вострую перасьцерагаючую ноту, пагражаючы карай.

Вядучы сьмяротную барацьбу з СССР у Кітаі, ад рэзультатаў якой—пэўне-ж залежала ўся сіла Англіі ў Азіі, дзе знаходзіцца галоўная падстава англійскага багацьця—Індыя, а праз гэта і ўся сіла яе, як сусьветнай дзяржавы, Англія ўсьцяж працавала, як і працуе дагэтуль над „акружэньнем", ці—„ізаляваньнем" СССР — з усіх бакоў, а перадусім—Эўропе. І гэтым сусьветным паядынкам Англіі з СССР азначаліся амаль ня ўсе важнейшыя падзеі 1927 г. на ўсім сьвеце.

Барацьба англійскага ўплыву з радавым ідзэ ўсьцяж ў-ва ўсіх балтыцкіх дзяржавах, лежучых на граніцах СССР, у гэтых дзяржавах, асабліва партовых, Англія заінтарэсавана, як у базах для яе магчыма ваеннай акцыі ў разе вострага аружнага канфлікту з СССР, да якога ўсьцяж рыхтуецца Англія, гуртуючы ўсьцяж дзеля гэтай мэты сусьветную коаліцыю, уплываючы адначасна ўсімі спосабамі—на ўтварэньне, дзе толькі можна, найбольш рэакцыйных, уласьніцкіх, фашыстаўскага дыктатарскага тыпу ўрадаў... Бо-ж толькі такім чынам здалее англійскі імпэрыялізм кінуць на вайну проці СССР народныя масы...

Але недарма адзін з сучасных павадыроў гэтых масаў сказаў, што — „у сучасны мамэнт урады ідуць направа, але народы ідуць налева"...

Калі ня толькі работніцкая кляса Англіі, але і усе англійскія доміniі забаранілі англійскаму ўраду ваенны паход проці Кітаю, і толькі здрада Чанг-Кай-Шэка разьбіла перамогу кітайскага народу, дык і проці СССР Англія ня можа выступіць сама—проці волі работнікаў усяго сьвету. Дык шукае магчымасьці зрабіць гэта чужымі рукамі. А перадусім прабуе фінансава і гаспадарча задушыць СССР, ізаляваўшы яго палітычна і гаспадарча ад рэшты сьвету.

Гэтымі мэтамі кіруецца ўся англійская палітыка ў дзяржавах, суседніх з СССР...

Адарваньне Італіі ад пэўнай прыхільнасьці да СССР было значнай перамогай англійскай дыпляматыі. У выніку гэтага нахіленьня Італіі да проці-радавага фронту зьявілася яе варожы да СССР акт прызнаньня за Румыніяй Бэсарабіі, што выклікала далейшае завастрэньне стасункаў між Італіяй і СССР. Але за гэта Англія павін[illegible]

плаціць чымсьці Мусоліні, як і за яго выступленьне побач з Англіяй у Кітаі.

Заплаціла Англія Італіі — згодай на захват Альбаніі, што, як ведама, амаль ня выклікала ваенны канфлікт на Балканах, які пэўне-ж, як у балканскі канфлікт у 1924 г., зараз-жа перайшоў бы ў — Эўрапэйскую, а пасьля і ў сусьветную вайну. На прыкладзе альбанскага канфлікту ясна відзаць, якой цаной дасягаецца Англіяй гуртаваньне проці радавага фронту у Эўропе... Гэтым-жа матывам кіруецца англійская палітыка і ў адносінах да Нямеччыны. Вялікім пасьпехам радавай дыпляматыі было — у адказ на бесарабскі пасьпех Англіі—заключэньне трактату прыязьні і нэйтральнасьці з Латвіяй, якая дагэтуль была пад моцным уплывам Англіі. Пасьля таго, як англійская агентура выклікала фашыстаўскі пераварот у Літве, часова цалком спыніўшы ўсялякія ўплывы ў краі ССРР, новая „брэш“ (прабойна) у „муры“ ўздоўж заходняй граніцы ССРР скасавала ўсю працу англійскіх „муляроў“, жадаючых замураваць Радавы Саюз, адзяліўшы яго ад рэшты Эўропы, а перадусім—ад Нямеччыны.

Барацьба ідзе ўсьцяж і ў Латвіі, і ў Эстоніі, і ў Фінляндыі, ня кажучы ўжо аб Польшчы.

Польшча, трэба прызнаць ей гэта, ня гледзячы на магутныя англійскія ўплывы, зразумела ўсю вялізарную небясьпеку для свайго нават існаваньня, калі яна будзе пакорна выпаўняць загады англійскіх падпалячаў... Польская дыпляматыя зразумела, што—значна выгадней — наадварот — самастойна лавіраваць паміж абодвума сьмяротна-варожымі абозамі, карыстаючыся пэўнымі ўступкамі ды рэальнымі карысьцямі з абодвух бакоў... Гэткім чынам, у пяршыню, трэба прызнаць, Польшча павяла самастойную палітыку, здабываючы гэтым найбольшыя выгады ды карысьці для сябе на міжнародавым полі.

Аднак-жа скрыжаваныя навакол Польшчы супярэчныя ўплывы — Англіі, Францыі, Нямеччыны і ССРР — робяць яе палітыку страшэнна ня шчырай... Гэтым перад усім тлумачыцца, што дагэтуль няма ніякіх вынікаў з перагавору яе з Радамі ў справе заключэньня трактату прыязьні ды ўзаемных гарантыяў, які даўно прапануе Польшчы радавая дыпляматыя. Гэтым трактатам Польшча значна аслабіла-б „заінтэрэсаванасьць“ Англіі ў польскіх лёсах, якая дала і ўсьцяж дае Польшчы шмат рэальных выгадаў...

Дзеля таго—адносіны паміж Польшчай і ССРР, ня гледзячы на іх значна ўгрунтаваўшуюся вонкавую лагоднасьць, ніяк ня могуць выліцца ў фармальна-праўныя, ясна і точна абавязываючыя нормы, але застаюцца далей „у плыўкім стане“... у якім — пэўне-ж у інтарэсах Англіі іх падтрымліваць чым далей...

У сярэдзіне траўня страшэнна завастрыўшаяся ў Кітаі барацьба між Англіяй і ССРР разрашылася — афіцыяльным разрывам дыпляматычных зносінаў — з пачыну Англіі.

Разрыў быў папярэджаны вобыскамі і разгромам касаў у радавых афіцыяльных установах, — падобна да таго, як гэта рабілася адначасна ў Кітаі — Чанг-Тсо-Лінам.

Ведама-ж, што „знойдзена было шмат кампраматуючага матэрыялу“...

Цікаўна, што якраз перад вобыскам і разрывам англійскія капіталісты зусім ужо падрыхтавалі 100-мільёнаую пазыку Радаваму ўраду, нават ня просячы ўрадавай гарантыі...

Як ведама, таксама ў 1924 г., калі Мак-Дональд ужо падрыхтаваў зусім падпісаньне гандлёвага трактату з Радамі і зьвязаную з ім значную пазыку для Радаў, павалыр кансэрватыўнай партыі апублікаваў слаўны „ліст Зіноўева“ англійскім камуністам, якім зваліў сацыялістычны ўрад Мак-Дональда...

Англія рашылася на такі рашучы крок, толькі пасьля таго, як добра падрыхтавала ўсё дый выбрала мамэнт найбольш адказны. Пасьпехі чырвонай арміі ў Кітаі заламаліся, дзякуючы кінутым Англіяй грошам на развал нацыянальнага руху. Пахсаваўшыяся адносіны з Францыяй былі спрытна наладжаны. Такім чынам — вобыск у радавым Аркосе выпаў з часам візыты французскага прэзыдэнта Брыяна ў Лёндане, дзе яму зроблена — нячувана ўрачыстае і „сэрдэчнае“ спатканьне...

Гэткім чынам адным ударам быў забіты і нарыхтаваны Эрыо і Брыянам ужо цалком Радавы трактат з Францыяй...

Разрыў Англіі з ССРР меў вялізарнае значэньне для ўсей сусьветнай палітыкі, распачаўшы новы пэрыяд у пляновай акцыі ангельскай дыпляматыі, скіраванай да поўнага акружэньня Радаў. Прыклад Англіі адразу спыніў усе нарыхтаваныя ўжо трактаты, акты прызнаньня, гандлёвыя ўмовы, якія адзін па адным ставіліся на чаргу дня дагэтуль. Падпісаньне гэтых трактатаў з Радамі зьяўлялася адгэтуль вызавам у бок Англіі, на што не рашалася нават Францыя, ня кажучы ўжо аб меньшых дзяржавах. Гэты акт Англіі ляжыць дагэтуль цяжкім каменем на вольнасьці руху і польскай дыпляматыі...

Аднак-жа Англія і пасьля разрыву, які заўсёды ў даваенныя часы быў раўназначны з абвешчаньнем вайны, не рашылася на вайну з Радамі, нам ужо ведама, чаму... Але гэта зусім не значыць, што Англія кінула думку аб вайне ды разгроме Радаў. Наадварот — цяпер яна пачала зусім ясную пляновую акцыю ў напрамку падрыхтаваньня вайны, настанавіўшы перадусім стабілізаваць ды фашызаваць усе тыя дзяржавы, якія — паводле яе думкі — павінны будуць адыграць ролю тых тапароў, якія засякуць на сьмерць Радавую Дзяржаву працоўных. Дзеля таго Англіі трэба было перадусім упарадкаваць свае адносіны да дзьвюх наймагутнейшых на сьвеце марскіх дзяржаваў. Амэрыкі і Японіі, каб забясьпечыць іх, калі ня ўчасьце ў вайне, дык прынамсь „прыязны нэйтралітэт“, асабліва важны для Англіі на Далёкім Усходзе—на ўсходніх тылох ССРР—дзе Японія і Амэрыка маюць вялізарную сілу.

І вось, распачынаецца дый цягнецца каля двух месяцаў слаўная Жэнэўская канфэрэнцыя ў справе „разбраеньня на моры“, якая ў канцы зрываецца Англіяй, што найлепш паказывае шчырасьць прапагаванага Англіяй ...для другіх мірнага разбраеньня.

Некаторы час пасьля — на верасьнёвым Агульным Зборы Лігі Нацыяў—тая-ж „пацыфічная“ Англія першая рашуча адкідае польска-галяндзкую прапазыцыю — аб прызнаньні ўсялякай вайны праступнай ды забароненай...

У сярэдзіне ліпня—у працягу 5 дзён—бушавала, як калаццеўшая бура сярод лагоднай пагоды пад ясным вэрсальскім сонцам у „стабілізаванай“ буржуазнай Эўропе—„венская рэвалюцыя“...

Венская рэвалюцыя ўказала на два вялізарнай важнасьці факты: на тое, што ў Эўропе ўсё зусім ня так ужо „стабілізавана“, як думаюць гэта паны Чэмбэрлены ды Пуанкарэ. Зразумела, што „ком-сацыялістычная сталіца Аўстрыі“ была лёгка задушана „хрысьціянска - дэмакратычнай аўстрыяцкай вёскай“, якой на падмогу сьпешна кінулі свае атрады і зычліва спачуваючыя суседзі...

Вялізарнай важнасьці фактам, выявіўшымся ў другой палове 1927 г., фактам, які можа зусім інакш павярнуць усё тое, што з такім спрытам рыхтуе ў сьвеце Чэмбэрлен зьявілася завастрыўшаяся страшэнна саперніцтва на вадзе і на... нафце—паміж Англіяй і Амэрыкай.

Амэрыка страшэнна раззлавалася на Англію за зрыў канфэрэнцыі ў справе разбраеньня на моры, заявіўшы ў выніку правалу справы, што—зараз-жа кідае на будову браняносцаў 400 мільёнаў даляраў, — каб у працягу некалькіх гадоў стварыць флёт, які будзе вялікшым, як англійскі, калі Англія адмовілася мець роўны з Амэрыкай...

Адначасна завастрылася страшэнна канкурэнцыя між Амэрыкай і Англіяй з-за панаваньня над сьветам—праз нафту.

Як ведама, нафта, але ня вугальле, як дагэтуль, дае цяпер магутнасьць ваеннатэхнічнай прамысловасьці дзяржавам. Нафтавы матор—праўдзівы „сьпірытус мовэнс“ жывы дух усіх машынаў новага тыпу: караблёў, лёкомабілеў, аўтамабіляў, аэрапляпаў і т. д., якія вырашаюць перамогу народаў у мірнай тэхніцы ці ў ваенным канфлікце. Дык трывалае сусьветнае панаваньне вялікай дзяржавы залежыць перадусім ад таго, сколькі яна мае нафты. Канкурэнцыя ідзе ўсьцяж усё вастрэй і ня відаць ніякага паразуменьня. На гэтай страшэнна заціятай „нафтавай вайне“ між Амэрыкай і Англіяй Рады пабудавалі сваю спрытную палітыку ды барацьбу проці англійскай блёкады—на „нафтавым фронце“, маючы вялізарныя запасы найлепшай у сьвеце нафты (на Бакінскім паўвостраве), Рады, якім амэрыканскі ўрад дагэтуль яшчэ адмаўляе ў фармальным прызнаньні, здолелі заключыць, калі не трактаты з ім, дык кантракты з нафтавымі магутнымі і ўплывовымі кампаніямі—на дастаўку нафты, атрымаўшы ад іх так патрэбныя ССРР значныя сумы грошаў. Для Радаў гэты „пралом“ у будаваньні Англіяй навакол іх муроў гаспадарчай блёкады, мае вялізарнае значэньне: маючы Амэрыку і Нямеччыну, Рады — не патрабуюць больш нікога для свайго жыцьця і гаспадарчага развою... Дый без Нямеччыны і Амэрыкі Рады могуць спакойна не баяцца ўсіх „скарпіёнаў“ п. Чэмбэрлена...

Што-ж датычыць Японіі, дык і тая ня пойдзе з Англіяй, калі проці яе будуць Амэрыка, Расея і Нямеччына.

7 чэрвеня забіты быў у Варшаве радавы пасол Войкаў. Радавая прэса пісала тады, што мае ўсе даныя думаць, што справа падрыхтавана не без „дапамогі“ з боку англійскіх агентаў, якія маюць інтарэс у тым, каб пасварыць добра радавы ўрад з польскім... Але, дзякуючы стрыманаму паступаньню ды развазе абодвух — канфлікт удалося зьліквідаваць так, што быццам адносіны між імі сталі яшчэ лепшымі...

Вялізарная сіла салідарнасьці магутнай арміі сусьветнага працоўнага народу—сярод „стабілізаванага“ буржуазнага ладу ў сьвеце—выявілася ў часе гучнага працэсу і казьні двух амэрыканскіх работнікаў-анархістаў, фальшыва абвінавачаных у рабунку — Сакко і Ванцэтті, па нацыянальнасьці італьянцаў. Літаральна ўвесь пралетарскі сьвет адгукнуўся на варварскі прысуд—клясавую помсту амэрыканскаў буржуазіі, якая проста—не пажадала нават праверыць магчымую судовую памылку...

У сярэдзіне верасьня папсаваліся—пэўне-ж—пад націскам англійскай дыпламатыі адносіны паміж Францыяй і Радамі. Францыя змусіла радавы ўрад—зьмяніць асобу радавага пасла ў Парыжу—Ракоўскага — за тое, што ён падпісаў адозву Комінтэрну да ўсіх работнікаў і жаўнероў усіх дзяржаў, а значыць і Францыі—„рабіць здраду“ — ў часе вайны з ССРР і наагул — разваліваць уласнае войска... Добрыя адносіны не наладзіліся да канца году. Перарваны навет перагаворы ў справе даўгоў, ня гледзячы на тое, што радавы ўрад „прынцыпова“ прызнаў царскія даўгі... Праўду казаць, дык прызнаў, але як ня „прынцыпова“, але — варункова—бо ж сказаў так: даеш—даю, ці інакш: даеш крэдыты, тады я плачу даўгі... Але так, што ў канцы... ад даходу з крэдытаў, праўду кажучы, мае зыску няменш, калі ня больш, як стратаў ад выдаткаў на сплату даўгоў... Францыя не згадзілася. Дык Рады сказалі, што—пачакаюць. Пачакаюць, пакуль Нямеччына адмовіцца плаціць адшкадаваньні.—Тады Францыя стане лагоднейшай.

У канцы году адзін па другім выбухнулі, амаль не даводзячы да вайны—два канфлікты — ў дзьвюх найбольш выбуховых асяродках найбольш фашызаваных—з дапамогай Англіі—часткаў Эўропы: на Балканах—з італьянскага боку, і над Балтыкай—з боку польскага...

Абодва канфлікты — югаслаўскі-італьянскі і польска-літоўскі залагоджаны часова, часова спынена вострая небясьпека вайны. Але—ані альбанская, ані літоўская справы ня вырашаны, дык—небясьпека вайны асталася—адложанай надалей...

Сьнежнявая сэсія Рады Лігі, якая „зьліквідавала“ польска-літоўскі канфлікт, як і адбыўшаяся беспасрэдня перад ён „падрыхтаваўчая камісія“ ў справе разбраеньня — праходзілі пры бліжэйшым удзеле радавай дэлегацыі; першая неафіцыяльным, другая навет—афіцыяльным. Упяршыню Рады прынялі ўчасьце ў працы ўстановы, створанай Лігай Нацыяў.

Рэзультат гэтай працы можна было прадбачыць згары, як гэта добра разумела і сама радавая прэса. Радавая прэса цьвердзіць, што Ліга Народаў зьяўляецца зручным прыладам у руках вялікіх імпэрыялістычных дзяржаваў—для зьдзейсьненьня іх панаваньня над малымі, дык і акцыя „разбраеньня“ датычыць, ведама-ж, гэтых малых. І калі радавая дэлегацыя запрапанавала рашучы праект — спыненьня, скасаваньня, зьніштажэньня ўсіх збраеньняў на сушы і на моры і ў паветры, дык гэта прапазіцыя спаткала спрытна прыкрытую сьмехам трывогу—сярод усіх дэлегатаў вялікіх дзяржаваў.

Новы год мае распачацца — пад лёзунгам таго-ж „разбраеньня“. На першыя месяцы новага году назначаны далейшыя пасяджэньні камісіі. Але ўжо згары відна, што справа скончыцца „пуфам“. Якраз у часе працы гэтай „камісіі“ амэрыканскія наглядчыкі-карэспандэнты пісалі з Жэнэвы ў амэрыканскія газэты, што ў выніку міру эўрапэйскія дзяржавы падзяліліся на два варожыя ўзброеныя ваенныя лягеры, якія зусім не жадаюць ані разбраеньня ані міру, але ўсьцяж рыхтуюцца да вайны...

Далама да гэтага вернага абразу — што адны рыхтуюцца да вайны абароннай, дый—каб адваяваць сабе права на жыцьцё адабранае ці загрожанае ім пераможцамі, а другія рыхтуюцца да вайны зачэпнай, захватнай, маючы намер разграміць „канчальна“ тых, што хочуць жыць сваім вольным жыцьцём — у сваіх нацыянальных дзяржавах, каб гэткім чынам — „канчальна спыніць небясьпеку вайны“...

Першы лягер хоча злучыць урады, адарваўшы іх чым больш ад народаў, азброіўшы іх закаванай у жалезную дысцыпліну арміяй, ды фашызаваўшы іх так, каб народы зрабіліся паслушнымі аўтаматамі.

Другі лягер хоча лучыць народы, таксама азброіўшы іх—нягорш іх ворагаў, хоча—вызваліць народы з-пад панаваньня чужынцаў ды сваіх уласных фашызаваных урадаў. Што паміж гэтымі двума лягерамі

Мароз і вынікі.

(З украінскага).

Мяцеліца-завіруха
У полі цягнік затрасае,
Усе машыны і матэры
Ад марозу расьпірае.
Прагноз:
Кажуць, як далей так будзе,
Калі дзе наўстануць „блёкі“,
Ці выборчыя „машынкі“ —
Разапрэ іх на ўсе бокі.
Дармаедам і што з імі
Ужо ядуць з адное міскі,
Пазамерзнуць—выбачайце —
...Навет пыскі.

Тэрэшка.

Ляо-Дзэ.

НОВЫ ГОД.

I.

Паліцыянт № 410250 N камісарыяту места Кішэнёва, Загорскі, у расшпіленым мундзіры, хадзіў узад і ўперад па сваім пакойчыку. Нэрвовымі крокамі мерыў ён ужо ў соты раз даўжыню гэтай невялічкай брудная скрыні, якую таўстая, сытая гаспадыня называла прыгожай кавалерскай кватэрай.

— „Гым“!... барматаў неяк заклапаціўшыся Загорскі; „судовая адказнасьць“!..

Паліцыянт змоўк. Бяз слоў прайшоўся ён разоў некалькі па пакоіку, упёрся разы са два лобам у вакно, на хвіліну ля яго затрымаўся, прабуючы выглянуць праз лёд на вуліцу і ўзноў крануўся ў сваю бясконцую падарож.

— „Так, цяпер судовая адказнасьць; за ёй пойдзе напэўна перавод у іншае месца, можа навет звальненьне са службы, а ў найлепшым выпадку—выгавар... І каму?.. Мне, Загорскаму, мне, паліцыянту, які не задумваючыся йшоў па вашай, паны начальнікі, камандзе ў вагонь і ваду, выконваў самыя горшыя загады?!.

Але вы аб гэтым усім забыліся... Га, забыліся!.. А ці вы наагул, гэта бачылі—хацелі бачыць, ацэнівалі?.. Можа за гэта вы далі мне якуюсь нагароду, падвысілі мяне ў чыне?.. Так, так—чакай!.. На чыны ды нагароды былі розныя бадзякі з Букарэшту, з Ясаў... Але караць вы ўзяліся мяне першым. А за што?.. За што“?..

Ён падыйшоў да стала і глянуў у люстэрка: на левым вócку відаць быў сіня-чырвоны рубец ад толькі што загоенай раны, зробленай пазногцямі чыйсь-ці рукі.

— „Га, вось яна прычына адказнасьці“!

Загорскі павёў пальцам па рубцу, паглядзеў яшчэ раз у люстэрка, сеў на старое, гнутае з боку крэсла і цяжка ўздыхнуў.

— „Ну і чым я вінават, што я ня мог ударыць гэту дзяўчыну?.. Рабіце выгавар, карайце,—але што мог зрабіць я, калі рукі мяне ня слухалі“? прагаварыў ён станоўчым голасам і, падпёршы рукой галаву, задумаўся аб нядаўных надзеях.

Марозны дзень ўстаў перад ім з усімі сваімі падрабязнасьцямі. Загорскі пачуў сябе ўзноў у камісарыяце ў ліку паліцыянтаў дзяжурных „на ўсякі выпадак“. У паветры чулася нейкая напружанасьць, начальства было знэрвавана, памінутна бегала з пакоя ў пакой, аб чымсьці пацiху шапталася, званіў раз-па-разу тэлефон у пакоі галоўнага дзяжурнага. Было відаць, што ў Кішэневе штосьці сталася, або чагосьці спадзяюцца. Адкульсьці, як па бяздротавым тэлеграфе, раптам пракацілася вестка, што ў горад прыяжджаюць левыя паслы англійскага парляманту. Прынесены кімсьці свежы нумэр урадавай газэты вестку гэту ня толькі сцьвердзіў, але і паглыбіў, бо даносіў, што англійскіх парлямантарыстаў спраўджваюць у Кішэнеў украінскія паслы румынскага парляманту з палітычнай мэтай.

Усім стала ясна, што ў горадзе рыхтуюцца маніфэстацыі.

Не пасьпелі аднак паліцыянты ацаніць гэтай весткі, як у суседнім пакоі рэзка адазваўся тэлефон. Яшчэ некалькі хвілін і да іх убег асьпірант з прыказам, што найхутчэй рушыць на L. пляц і рассеяць маніфэстантаў, якія напраўляліся да вастрогу. Паліцыянты ўздрыгнулі, машынальна ўскочылі, схапілі вінтоўкі і іншыя прылады і пасьпешна вышлі за сваім камандзірам на двор, дзе іх ужо чакала грузавое аўта.

Моцна сьціскаючы ў руках вінтоўкі, ускаквалі яны ў аўта, стараючыся быць як найболей пасярэдзіне платформы: няпэўнасьць, што ім ўдасца лёгка разагнаць маніфэстацыю—адняла амаль у-за ўсіх іх адвагу і энэргію, кожны рух быў нейкі аўтаматычны, штыўны, быццам выконваўся ня людзьмі, а якімісь зьбялеўшымі бяз меры машынамі.

Аўта прыехала да вастрогу запозна: маніфэстанты з песьняй на вуснах густою стройнаю калёнаю валілі з пляцу на Вастрожную вуліцу і падыходзілі ўжо да вастрогу. Пэўны сваёй праваты, цьвердым крокам ішоў гэты натоўп уперад, не вагаючыся і ня думаючы, што яго можа там спаткаць. Вочы дэманстрантаў гарэлі дзіўным агнём, з кожнага руху біла энэргія, сіла, адвага. У руках у іх ня было ніякага аружжа, навет звычайнай палкі і тэй ніхто з іх ня меў.

— „Разыйдзісь“!.. скамандавала паліцыя, загараджваючы дарогу.

— „Прэч з фашызмам!.. Хай жывуць палітычныя вязьні! Хай жыве сялянска-работніцкі ўрад“!.. раздаліся зычныя галасы з натоўпу, які ў адказ на каманду разыйсціся, яшчэ болей прыбавіў шагу.

— „Разыйдзісь!.. будзем страляць“! крычаў начальнік.

— „Страляй—сьмерць нам ня страшна!.. Далоў з фашызмам!.. Хай жыве сялянска-работніцкі ўрад“!..—крычалі дэманстранты, надыходзячы к самай браме вастрогу і чуць ня стыкаючыся грудзьмі з паліцыяй.

— „Хай жыве сялянска - работніцкі ўрад“!.. крычалі ў адказ палітычныя вязьні з вастрогу.

— „Тата!.. тата!.. ці чуеш мяне?.. я тут“!.. крыкнула праразьлівым, поўным сьлёз голасам, худая невялічкага росту дзяўчына, гадоў якіх шаснаццаці, у летнім кароценькім вузкім пальце на плячох і ў танным капялюшы на галаве і, як вар'ятка, кінулася ўперад, а за ёю і ўсе дэманстранты.

— „Увяць яе“—скамандаваў начальнік Загорскаму.

Машынальна кінуўся Загорскі ўперад і схваціў дзяўчыну за локаць, сілючыся зацягнуць гэту чуць жывую істоту ў вастрожную браму.

— „Прэч з дарогі, наймiт!.. я не дазволю, каб ты сваімі рукамі датыкаўся да мяне!.. ускрыкнула дзяўчына, кідаючы на яго цэлыя снапы гнеўнага агню і, як кошка, учэпліваючыся ў твар Загорскага пазногцямі сваіх худых кашчавых рук.

Кроў ліпкая, цёплая нацякла на яго шчацэ, а ён, як загіпнатызаваны, стаяў на месцы, крэпка трымаючы руку дзяўчыны.

— „Пушчай“!.. злосна праз зубы крыкнула ўзноў дзяўчына, з усей сілы ўдараючы яго кулаком ў грудзі.

Штосьці блізкае, знаёмае, роднае пачулася ў гэтым голасе Загорскаму і ён уздрыгнуў усім целам сваім. Усё замуцілася і забегала ў галаве ў яго; вуліца, таўпа, астрог, кудысь зьніклі; перад ім засталася адна гэта адважная дзяўчына з яе палаючымі агнём вачыма і худым блядым тварам.

Настаў крытычны мамэнт. Бачучы няздарнасьць Загорскага, чатыры паліцыянты кінуліся да яго на помач, натаўп кінуўся ратаваць дзяўчыну, на вуліцы настала тузаніна, прабег якой Загорскі ніяк ня мог сабе прыпомніць.

Прачнуўся ён у астрожных сенях, калі дэманстранты былі ўжо рассеяны і разагнаны, а каля вастрогу панаваў спакой, лад і парадак. Шынэль яго была ў гразі і ў двух

мае выбухнуць вайна—гэта вельмі падобна да праўды... Але вось — хто пачне першы наступленьне.. Трэба думаць — таксама, як заўсёды:—першы лягер...

На чале першага лягеру стаіць — Чэмбэрлен. Ці паспее толькі вось ён зрабіць „рашучы крок" — да новых выбараў, якія пэўне-ж зваляць яго і яго урад,—пабачым.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Аб назначэньні Цара Генэральным Выбарным Камісарам.

У сувязі з пагалоскамі, што найвышэйшы суд злажыў на жаданьне ўраду другую лісту кандыдатаў на становішча генэральнага выбарнага камісара, Gazeta Sądowa паведамляе, што прадстаўлі адну толькі лісту кандыдатаў з 3 судзьдзямі: Пекіцкім, Міхайліцам і Дуткевічам.

Канстытуцыя, як ведама, выразна кажа, што генэральным выбарным камісарам можа быць вызначаны толькі адзін з трох кандыдатаў, прадстаўленых найвышэйшым судом. Ліста кандыдатаў была адна. П. Цара там ня было, камэнтары тут лішні, справа ясная цяпер і без гэтага.

Арышты членаў Ц. К. Ком. Партыі.

Газэты зноў паведамляюць (каторы гэта раз на год.—Рэд.?) аб арыштах членаў у Ц. К. К. П. П. на гэты раз, як паведамляе „Głos Prawdy", арыштаваны 17 членаў Ц. К. (?) і гэтым зліквідаваны толькі агітацыйны аддзел Ком. Партыі. (Колькі-ж тады мусіць быць членаў у Ц. К. наагул—Рэд.?) Апрача таго, знойдзена друкарня Ц. К. К. П. П. і архіў, у якім знойдзена толькі ліст з турмы Ланцуцкага.

Апрача гэтых 17 членаў Ц. К. (!?) арыштавана яшчэ 9 асоб.

„Głos Prawdy падае наступныя прозьвішчы: Чэслаў Луковскі, Аляксандар Астроўскі, Мечыслаў Квятковскі, Эдвард Ведзіцкі, Рамаі Гранас, Цэцылія Грынбэрг, Чэслава Гросэр, Мойша Амстэрдамскі, Браніслаў Каміньскі, Лявон Скібінскі, Казімір Грэхульскі, дырэктар выдавецтва „Książka" Гэнрых Вітнэр, Тадэўш Жарскі. Самуіл Быховскі, Гэнрых Косовскі, Егет Тайх, Гэлена Альтэнбэрг, Ганна Гольдбэрг. З тых, на якіх было спэцыяльна зроблена гэтае паляваньне, ўцек як падае Глос Праўды, Ян Гэмпэль выдатны публіцыст і тэарэтык марксізма ў Польшчы.

Сымвалічны пажар слаўнага замчышча графа Тарноўскага ў Дзікаве.

21 сьнежня ў маёнтку ведамага польскага магната графа Тарноўскага, Дзікаве, пажар зьніштожыў вялізарны палац—з масай вельмі цэнных калекцыяў і бібліатэкай кнігаў і рукапісаў. Толькі каля паловы ўсяго багацьця, сабраннага ў палацы ў працягу некалькіх вякоў,удалося адратаваць ад вагня.

Цікаўна, што нядаўна ў гэтым самым палацы ў Дзікаве адбылася палітычная, выбарная нарада найбуйнейшых дый тытулаваных абшарнікаў („дзікаў", ці „зубраў") усей Польшчы. Нарада мела мэтай—шляхам выбараў з дапамогай прыхільнага да абшарнікаў ураду, які прыслаў на нараду свайго „інструктара" палк. Слаўка, (асабістага ад'ютанта-даверанага марш. Пілсудскага)—адбудаваць старадаўняе панаваньне магнацтва ў Польшчы...

Ці не зьяўляецца гэты пажар у Дзікаве—сымвалічнай перасьцярогай—таго лёсу, які чакае гэтую недарэчную думку паўстаўшых з магілаў мінуўшчыны „трупаў" — вярнуць сабе ізноў уладу над жывымі народамі краю...

Непамысны для Польшчы прысуд Гаагскага Трыбуналу ў справе Хожаўскіх хімічных заводаў.

Гаагскі Міжнародны Трыбунал выдаў прысуд, якім адкінуў польскі пагляд на справу нямецкіх хімічных заводаў у Хожове, якія польскі Урад канфіскаваў, як „ваенную здабычу"—ня гледзячы на тое, што нейкі час перад тым нямецкі Урад прадаў гэтыя заводы прыватнай кампаніі. Польскі урад абвясьціў гэтую прадажу „фікцыйнай" (фальшывай), дзеля чаго адмовіўся заплаціць адшкадаваньне за канфіскату фабрыкаў. Нямецкі Урад падаў скаргу ў Трыбунал у Гаазе, які пасьля доўгага працэсу урэшце вырашыў справу на карысьць Нямеччыны.

Бэрлінская польская газэта „Полонія" дзівіцца, чаму гэта польская прэса—як ваду ў рот набраўшы, маўчыць аб гэтым прысудзе, некарысным для Польшчы, аб якім ня менш нямецкая прэса піша ўсьцяж вельмі дэтальна. Аб гэтым прысудзе не паведаміла польскае грамадзянства навет польскае афіцыяльная тэлеграфная агенства, якое мае абавязак гэта зрабіць... Ясна, што агенства і „санацыйная" польская прэса ня хоча рабіць непрыемнасьцей шэфу польскага ураду, які толькі што такім пераможцам вярнуўся з Жэневы. Так піша „Полонія".

Замест расстрэлу—павешаньне у Польшчы.

Польскі Урад выдаў дэкрэт Прэзыдэнта, паводле якога выкананьне сьмяротных прысудаў цывільнымі судамі—звычайнымі ці даразнымі—ня будзе болей рабіцца вайсковымі ўладамі—шляхам расстраляньня, але—цывільным катам—праз павешаньне. Толькі ў часе існаваньня ваеннага ці іншага „надзвычайнага" палажэньня можа быць тасавана расстраляньне — у паразуменьні з ваенным міністрам.

Падвышка цаны на соль.

З 21/XII падвышана ўрадам цана на соль з 32 гр. за кіло да 34 гр. Гэта называецца барацьбой супроць дарагавізны.

Пасьпехі Бойкі.

Галоўная Управа „Хрысьціянска-Народнага Саюза" кс. Стаякоўскага ў Кракоўскім ваяводзтве пастанавіла прылучыцца да Бойкі.

П. П. С. усталіла сьпіскі кандыдатаў.

21/XII адбылася паседжаньне ў К. ППС, на якім усталена сьпіскі кандыдатаў.

Выбарныя камбінацыі сацыял-угоды.

У Кракаве, як паведамляе прэса, стварыўся блёк сацыял-угоды, у які маюць увайсьці ППС, Бунд, нямецкія сацыялісты і нейкія групкі славянскіх сацыялістаў. (Ці не Мамонька ?—Рэд.).

Яшчэ аб блёку сацыял-угоды.

Як паведамляе „Głos Prawdy", ППС. пойдзе на выбары супольна з нямецкімі сацыялістамі. Існуе магчымасьць далучэньня Бунда. У гэтай справе мае на гэтым тыдні адбыцца канфэрэнцыя між прадстаўнікамі нямецкіх, польскіх і жыдоўскіх сацыял-угодаў у Лодзі. На гэтай канфэрэнцыі будзе разглядацца ўжо справа кандыдатур.

ППС і Вызваленьне, ня гледзячы на выразную волю „Дзядка", каб Вызваленьне і ППС ня йшлі разам на выбары, П (аслушныя) П (акорная) С (лугі) ў некаторых мяйсцох не датрымоўваюць сваіх забавязаньняў. Гэтак, як паведамляе„Głos Prawdy", ППС і Вызваленьне пойдуць разам у пав. Петрковскім і Бжэзінскім. Ня выключаны мяйсцовы блёк яшчэ і ў іншых паветах.

Урадоўцы ня могуць кандыдаваць у тых выбарных акругох, у якіх працуюць.

Міністэрства ўнутраных спраў выдала на падставе ардынацыі выбарчай загад, не дазваляючы ўрадоўцам кандыдаваць у той выбарнай акрузе ў Сойм ці Сэнат, у якой яны служаць. Гэтая забарона датычыць і тых асоб, якія пакінулі службу ў прадвыбарным часе або былі перанесены ў іншую акругу, але служылі ў папярэдняй у дзень 5 га сьнежня.

Заграніцай.

Новы сэнат вольнага места Гданска.

Новы сэнат (урад) Вольнага места Гданска дагэтуль яшчэ ня можа сканструавацца, ня гледзючы на тое, што пасьля выбараў прайшло ўжо шмат часу. На выбарах, як ведама, перамаглі левыя ды цэнтравыя дэмакратычныя партыі, а найбольш галасоў ды мандатаў здабыла сацыял-дэмакратыя. Дык справа ідзе цяпер аб стварэньні коаліцыі (супрацоўніцтва) — сацыял-дэмакратаў, цэнтраўцаў і лібэралаў. Старшынёй ураду, ці—паданцыгску—прэзыдэнтам сэнату, мае быць сацыял дэмакрат, як прадстаўнік найвялікшай фракцыі парляманту; віцэ-прэзыдэнтам быццам таксама мае быць сацыял-дэмакрат.

Трэба думаць, што такі ўрад — з перавагай сацыял-дэмакратаў—лягчэй дойдзе да паразуменьня з Польшчай у розных роду спорных справах, якія цяпер усьцяж разглядаюцца ў Лізе і ў Гаазе (у Гаагскім Міжнародным Трыбунале).

Вальдэмарас ідзе на ўступкі (?).

З Коўна ідуць весткі, быццам Вальдэмарас ідзе на ўступкі, прапануючы апазіцыі паразуменьне. Быццам пасьля новага году, як заявіў сам прэм'ер, пачнуцца рашучыя перагаворы з апазіцыяй — аб стварэньні коаліцыйнага ўраду. Вальдэмарас ставіць варункам, каб партыі апазіцыі не выстаўлялі толькі ў міністры асобаў, якія, выступаўшы востра проці прэм'ера, папсавалі з ім асабістыя стасункі. Ад сацыял дэмакратаў ды народных сацыялістаў Вальдэмарас, апроч таго, трэбуе, каб яны рашуча парвалі ўсялякія адносіны з літоўскімі эмігрантамі, якія за граніцай вядуць проці яго барацьбу.

Літоўскі афіцыёз — аб варунку распачацьця перагавораў з Польшчай.

Афіцыяльны орган літоўскага ўраду „Летувіс" зьмясьціў перадавіцу, у якой перадусім даводзіць, што літоўскі ўрад здабыў поўную пабеду ў Жэнэве. Перадусім — рэзалюцыя Рады пазбавіла Польшчу магчымасьці тасаваць аружную сілу проці Літвы... Пасьля — літоўскія скаргі на гвалты польскага ўраду ў Віленшчыне над літоўскімі дзеячамі знайшлі цалком увагу з боку Рады. А галоўнае, гэта—тое, што Рада пакінула „адкрытым" літоўска-польскі спор з-за Віленшчыны. Дык, — калі Рада адначасна „парадзіла" Польшчы і Літве распачаць перагаворы аб узнаўленьні нармальных стасункаў, дык ясна, што гэтыя перагаворы якраз і павінны распачацца—з спорнай справы аб Віленшчыне. Запраўды-ж,—Літва ня прызнае сталай граніцай тэй „дэмаркацыйнай лініі", якая праведзена была аднабочна — шляхам ваеннага гвалту — Польшчай. Гэта значыць, што паміж Літвой і Польшчай няма прызнанай з абодвух бакоў граніцы. А ведама-ж — без устанаўленьня граніцы ня можна пачаць ніякіх перагавораў у справе камунікацыі — чыгункавай ці паштовай, без якой, з свайго боку, ня можна ўзнавіць нармальных стасункаў торговых і іншых. Гэткім чынам—ясна, што перагаворы павінны распачацца справай перагляду граніц.

Дык пасьпех гэтых перагавораў цалком залежыць ад польскага ўраду. Ён ведае дамаганьні Літвы, і, калі захоча пайсьці на ўступкі, дык жаданьне Лігі будзе споўнена.

Сэнсацыйная рэвэляцыя англійскай газэты.

Англійская газэта падае сэнсацыйныя весткі аб тым, што рабілася ў Жэнэве ў справе польска-літоўскага спору дый — што значыць канцавы пункт рэзалюцыі Рады Лігі, датычуцы Віленшчы. Тады, як Вальдэмарас стаяў рашуча на груньце літоўскіх правоў на Вільню, Пілсудскі быццам згадзіўся на тое, каб у рэзалюцыі пакінута была пытаньне аб Віленшчыне „адкрытым". Пілсудскі заявіў у Жэнэве, што ён упэўнены ў тым, што мірныя адносіны з Літвой з часам давядуць да натуральнага ды дабравольнага палітычнага аб'яднаньня абодвух народаў — польскага і літоўскага...

У справе ўзнаўленьня англійска-радавых стасункаў.

На пасяджэньні парляманту 21 сьнежня Чэмбэрлен—на запытаньне аднаго з паслоў: ці на падставе жэнэўскай размовы міністра з Літвінавым бачыць англійскі ўрад магчымасьць распачацца перагавораў з радавым урадам,—адказаў, што—пакуль сучасныя адносіны паміж абодвума ўрадамі ня зьменяцца на лепшыя, ён ня бачыць магчымасьці паразуменьня.

Тое, што робіцца англійскім урадам у Кітаі, найлепш паказвае, чаму англійскі міністар „ня бачыць магчымасьці паразуменьня з Радамі"...

Цікаўная палеміка ў справе зьместу рэзалюцыі Рады Лігі Нацыяў адносна да польска-літоўскага спору.

Частка англійскай прэсы, падтрымліваючы становішча Літвы ў яе споры з Польшчай з-за Вільні, даводзіць, што запраўды — Рада Лігі, пазываючыся на апінію камісіі сваіх праўнікаў, пастанавіла, што рашэньне Рады Паслоў зусім ня вяжа Лігі Народаў, якая можа ізноў перагледзець справу Віленшчыны, як ужо пераглядала шмат падобных справаў дагэтуль.

Быццам выраз гэтай сваей незьвязанасьці пастановай Рады Паслоў Рада Лігі і дала ў канцы рэзалюцыі, пакінуўшы справу Віленшчыны адкрытай"...

Француская прэса, ня кажучы ўжо аб польскай, энэргічна зьбівае гэты „вельмі небясьпечны для мірнага ладу ў Эўропе" пагляд часткі англійскай прэсы. Афіцыёз францускага ўраду „Тан" даводзіць, быццам „рашэньні Рады Паслоў (Антанты) маюць сілу закону". Для каго... — Пэўне-ж толькі — не для тых дзяржаваў, якія ня маюць паслоў у гэтай Радзе дый ня прызналі яе „пастановаў"... Што датычыць Лігі, дык і для яе маюць сілу закону толькі тыя пастановы Рады Паслоў, якія яна прызнала. Што-ж датычыць наагул справы перагляду граніцаў, дык аб гэтым праве Лігі выразна сказана ў яе статуце. „Тан" даводзіць, быццам дзеля гэтага—

мясцох навет падзертая; усё цела яго балела і ныла.

І цяпер гэтая дзіўная дзяўчына ўстала перад ім, як жывая, і здавалася крычала:

— „Прэч з дарогі"!... і пылала сваімі вачыма.

— „Га, хто ты такая"?... — прагаварыў ён голасна, быццам дзяўчына і сапраўды была перад ім жывая.

Сьцены маўкліва прынялі гэта пытаньне і схавалі на векі.

Загорскі ўздрыгнуў і падняў галаву.

— „Што гэта са мною?" — прагаварыў ён цяжка ўздыхнуўшы, і глянуў у вакно, на якім, быццам камякі дарагія, гарэў і іскрыўся, ад электрычнай лямпы на вуліцы, лёд.

— Наступала зорная ноч, ноч Сыльвэстрава,—Навагодняя, ноч забавы і радасьці.

— „Пайсьці кудысь, павесяліцца, выпіць і пагуляць з якойсь жанчынай?... Можа хоць трохху стане на душы весялей?!"... рашыў Загорскі і пачаў апранацца ў цывільную вопратку, насіць якую яму было дазволена.

II.

Па цёмных, крутых, вузкіх сходах спусьціўся Загорскі ўніз, выйшаў на вуліцу і павярнуўшы налева, узыйшоў на мост. Рака была яшчэ не замерзшы. Халодная брудная вада яе з ціхім чуць чутным бульканьнем качілася ў Чорнае мора; сяды-тады большая ці меншая крыга лёду, ныркуючы і круцячыся, плыла ў невядомую дарогу.

Абраз гэты Загорскаму быў добра знаны і яго ня вабіў. Шпаркім крокам перайшоў ён праз мост і па вузкой крутой вуліцы пачаў паднімацца ўверх, кіруючыся к гораду. Усё на гэтай вуліцы было пуста і ціха—брамы і вокны зачынены, крамы пазамыканы—толькі пасьпешныя крокі двох-трох сьпяшаўшыхся таксама кудысь хлапцоў будзілі гэту нямую цішыню. Але як толькі Загорскі падняўся на гару і перад ім адчыніўся невялічкі прыгожы пляцок, усё адразу зьмянілася. Крык, гоман шум напоўнілі адразу паветра. Жыцьцё тут біла і кіпела з ўсей сілы: з вокан біў сьвет, з кавярань і растаранаў няслася музыка, снавалі ўзад і ўперад напудраныя і намалявзныя дзяўчаты, круціліся ласа на іх паглядаўшыя салдаты, там і гэнам, затрымаўшыеся каля сьцяны ці ў браме, пара аб чымсьці згаварвалася і таргавалася, дзьве ці тры з гэткіх пар перад самым носам Загорскага схаваліся ў дзьвярох готалю.

І гэты абраз быў яму добра знаёмы: ён наперад ведаў, што ў готаль увойдзе заўсёды першая дзяўчына, што яна бойка, развязна, прывычнаю рукою сама адчыніць дзьверы і сьмела нераступіць парог; салдат-жа заўсёды будзе ісьціззаду, паходкай нясьмелай і, патупіўшы вочы—быццам ён штосьці ўкраў, або ідзе красьці.

Не зварачываючы ўвагі на заклік гэтых багінь ночы „можа пойдзем?" — ішоў Загорскі далей, ішоў таксама шукаць сабе „багіні", але ня тут: тут быў прыпынак салдацкі і Загорскі заўсёды аднасіўся да яго з пагардай.

Праміну́ўшы дзьве-тры кавярні, увайшоў ён на залітую сьветам шырокую вуліцу. Тут ужо пачалася сапраўдная таўкучка: прыбраныя і выстраеныя таўстыя багатыя жанчыны, у кампаніі з такімі-ж разадзетымі мужчынамі, высока задзершы галовы, насупіўшыся, з пагардай, важна паглядвалі кругом на ўсіх і зьнікалі ў багатых цукернях ды растаранах; абарваныя, чуць ня голыя дзеці, з цэлымі кіпамі каляровых рэклям бегалі ад аднэй пары да другой; аўта саплі і раўлі, званілі званкі і шархучкі возьнікаў; бегалі з тацамі на галовах пасыльныя з пякарняў і цукерняў, сьпяшаючыся што найхутчэй занясьці багатым кліентам торты і бабкі, там і гэнам абарваны, чуць жывы, худы жабрак, прытуліўшыся ў цёмным кутку брамы; нясьмела выцягваў сваю кашчавую сінюю руку і зорка аглядаючыя, ці няйдзе дзесь паліцыянт, кланяўся нізка сівой свайей галавой усім праходжым, вымаліваючы грошы на хлеб, дзьве ці тры абарваныя жанчыны, тулячы да худых сваіх грудзей малых дзяцей, таксама нясьмела прайшлі праз вуліцу, выцягваючы пасьпешна руку з просьбаю хлеба і пужліва азіраючыся кругом; скорчыўшыся ад цяжкай ношы, насільшчык, абліваючыся як ў пятроўку потам і цяжка сапучы, валачыў кудысь вялікі мяшок—усё гэта пераплуталася і парамяшалася, творачы якуюсь каламесіцу, у якой на фоне багацтва, роскашы і збытку высоўвалі свае кашчавыя даўгія рукі бяда, голад і холад, ляпаючы і скрыгаючы сваімі страшнымі зубамі.

Гэта ўсё чамусьці сягоньня, як ніколі перш, кінулася ў вочы Загорскаму і ён пачаў пільна прыглядацца да таго, што кругом яго тварылася, прыглядацца не як паліцыянт, які шукае „крамолы" проціў пісаных законаў і распараджэньняў, а як чалавек, як грамадзянін. І ў яго галаву раптам прышло пытаньне.

— „Чаму ў гэту Новагоднюю ноч ня ўсе весяляцца, чаму ў той час, як частка сьпяшыць весяліцца, большасьць людзей забіта горам і працай"?

Аднак, прыкрае ўражаньне скора ў яго ўступіла свае месца пачуцьцю здаволенасьці сваім лёсам, пачуцьцю гордасьці з свайго становішча і вышэйшасьці ад гэтага галоднага, абдзёртага шэрага натаўпу.

— „Якое мне дзела да гэтых людзей?... Найшоў чым забіваць сабе галаву: глядзі, рабе, сябе—будзе досыць з цябе" падумаў ён сабе і, каб зьмяніць думкі, пачаў закурваць.

— „Можа пойдзем"? спыталася ціха, нясьмела якаясь дзяўчына, штурхаючы асьцярожна, быццам зьнянацку, яго ў бок.

Загорскі падняў галаву і скамянеў на мейсцы: прад ім грызучы нэрвова сланэчнік і патупіўшы стыдліва вочы, у цяні высокага дзерава стаяла тая-ж самая дзяўчына, арыштаваць якую ён хацеў у часе дэманстрацыі натаўпу перад вастрогам:

Наступіла маўчаньне; Загорскі праніклі́ва глядзеў на дзяўчыну і здавалася мераў яе з ног да галавы: дзяўчына патупіўшы вочы грызла сланэчнік і, быццам чакаючы сьмяротнага прысуду, баялася падняць вочы.

— „Што ж пойдзем"? спыталася яна ўзноў.

— „Пойдзем, але куды"? адказаў Загорскі голасам, з якога чулася пытаньне, зьвернянае ня столькі да дзяўчыны, колькі да сабе.

— „У готэль S... тут недалёка"...

— „А ў іншае месца са мной пойдзеш?...

Дзяўчына замялася і няведала сама, што адказаць; у вачах яе адразу мігнула нявера і якісьці страх, каб яе не ашукалі. Загорскі заўважыў гэта адразу.

— „Ашукаваць ня буду „прагаварыў ён, вынімаючы з партфэлькі чатыры банкноты і ўсоўваючы іх у руку дзяўчыны.

Тая пасьпешна, канвульсыўна, быццам баючыся, што грошы ад яе кудысь уцякуць, заціснула іх у руцэ і задумалася над тым, ці хаваць іх, ці не. Страх перад чымсьці няведамым, грозным замаляваўся на яе твары—яна пачала то чырванець, то бялець.

— „Ня бойся, мы нікуды далёка ня пойдзем" — прагаварыў ён лагодна, мякка, можа навет першы раз за час сваей службы. „Мы зайдзем толькі вось сюды ў растаран спаткаць Новы Год"...

Дзяўчына яшчэ раз уздрыганула, але на астатку падала яму сваю руку і яны, як старыя знаёмыя, ўвашлі ў растаран.

III.

У салях растарану ўжо ўсе амаль сталы былі занятыя. Разадзетая па апошняй модзе публіка, рыхтуючыся спатыкаць Новы Год, падкраплялася каньяком, вінóм і лікёрамі; музыканты аўтаматычна, як заведзеныя машыны, ігралі розныя тандэтныя ўвэртуры і маршы і нэрвова, быццам ня могучы дачакацца канца ночы, паглядалі на загарак; лякаі чуць не бягом разносілі закускі і выпіўкі.

— „Асобныя пакоі ёсьць?" — спытаўся Загорскі ў выбягшага да іх на спатканьне лёкая, даючы яму адразу „на гарбату".

— „Калі ласка"— адказаў той, нізка ім кланяючыся і просячы іх ісьці за імі.

канешна згода абедзьвюх староnаў. Так, але—пад націскам Лігі... А калі згоды ды паразуменьня не дасягнута, тады...—Тады Статут Лігі Нацыяў, маючай мэтай забясьпечаньне процi вайны, выразна прадбачыць магчымасьць тасаваньня ваенных спосабаў перагляду граніцаў, якія... „сталі награжаць міру“...

Новыя сэнсацыі ў справе літоўска-польскага спору ў Жэневе.

Радавая прэса, якая ня зьвязана ніякімі „дыплёматычнымі меркаваньнямі“, раскрывае на сваіх старонках вельмі цікаўныя, а часта сэнсацыйныя тайны хітрай дыплёматыі заходніх дзяржаваў, якія заходня-эўрапэйская буржуазная прэса часамі хацела б, можа, нахаваць цішком...

Так і ў справе жэнэўскіх перагавораў радавая прэса раскрывае запраўды-ж сэнсацыйную акцыю італьянскай дэлегацыі, якая у Жэнэве ўвесь час падтрымлівала Літву процi Польшчы... „Палажэньне, створанае ў Жэнэве, аказалася значна больш скамплікаваным, чым гэта сабе прадстаўляла польская дыплёматыя... „Як высьветлілася, Вальдэмарас неспадзявана для сябе знайшоў падтрыманьне з боку італьянскай дыплёматыі, якая спрытна выкарыстала справу Віленшчыны, як козыр процi Францыі“. Ну, і, ведама-ж, і Польшчы...

„Дык, у рэзультаце так скрыжаваўшыхся інтарэсаў вялікіх дзяржаваў — інтарэсы Польшчы павінны былі адысьці на другі плян... Польскі міністар замежных спраў ня здолеў справіцца з такой адказнай дыплёматычнай барацьбой дый — зьвярнуўся да Варшавы — паклікаўшы на ратунак марш. Пілсудзкага“...

І Пілсудзкі, значыць, як высьвятляе ангельская прэса, вымушаны быў—„дзеля хуткасьці вырашэньня“ — згадзіцца накінуць справу Віленшчыны адкрытай, як трэбаваў гэтага Вальдэмарас. Калі праўда тое, што пішуць „Известия“, дык відаць „прыязьнь“ паміж Пілсудзкім і Мусоліні ня вельмі абавязвае Мусоліні...

Дзеля таго ён так лёгка зрабіў цяпер уступкі Літве ў цэлым шэрагу пунктаў, а перадусім—у справе ўтрыманьня за Літвой яе прэтэнсіі да Вільні, што гэтая лёгкасьць зьдзівіла ўсіх у Жэнэве. Толькі дзеля таго так лёгка ды хутка дайшло да паразуменьня паміж Польшчай і Літвой у Жэнэве і да прыняцьця імі формулы рэзалюцыі, апрацаванай Радай. За гэтую ўступчывасьць Пілсудзкага Рада была вельмі ўдзячна Пілсудзкаму. Ангельская газэта канчае заклікам да літоўскага народу, каб той зразумеў добра гэты факт прыхільнасьці да яго з боку Пілсудзкага. Трэба думаць, што зразумее... Дзеля таго-ж і баіцца кожны літоўскі ўрад навет узнаўленьня нармальных стасункаў з Польшчай.

Радавая прэса ў справе польска-літоўскіх перагавораў.

Цікаўны камэнтарый (тлумачэньне, высьвятленьне) дае справе польска-літоўскіх перагавораў радавая прэса.

Як ведама, як радавая таксама і нямецкая дэлегацыя, рашуча парадзіла ў Жэнэве Вальдэмарасу спыніць „стан вайны з Польшчай“, добра ведаючы, што гэтым зусім ня сьмяняўся „стан спору“ з Польшчай з за Віленшчыны, які можа быць вырашаны толькі беспасрэдным паразуменьнем Польшчы з Літвой. Як ведама, СССР паводле Рыжскага Трактату абавязалася толькі пасьля гэтага паразуменьня прызнаць польска літоўскую граніцу канчальнай. Дык—у арт. „Вузел не развязаны“ — „Известия“ таксама, як і літоўскі афіцыёз, пішуць, што перагаворы паміж Літвой і Польшчай павінны пачацца якраз з паразуменьня ў справе граніцаў.

„Аднак-жа—ці можна сказаць, што перагаворы гэтыя будуць вясьціся ў нармальнай атмасфэры ўзаемнага даверя“?

На гэтае пытаньне газэта адказвае адмоўна. Пазываючыся на „афіцыяльны“ орган уплывовых польскіх вайсковых колаў „Польска Збройна“, які ўсьцяж трэбуе далучэньня Літвы да Польшчы, „Известия“ пішуць:

„Рэзалюцыя Лігі Нацыяў робіць цяжэйшым для Польшчы яўнае аружнае выступленьне процi Літвы, але зусім ня спыняе магчымасьці падрыхтаванага Польшчай непасрэдняга ўтаргненьня ў Літву, не перашкаджае ціхай інтэрвэнцыі (ўмяшацельства) ў унутраныя адносіны ў Літве,—дакананьня там новага перавароту, які-б умагчыміў заключэньне гэткай польска літоўскай уніі“...

Дзеля таго, як цьвердзіць газэта, небясьпека вайны зусім ня спынена, але наадварот — у кожнай хвіліне яна можа зрабіцца актуальнай.

„Польска літоўская граніца не перастала быць запалам вайны ў Эўропе. І будзе так датуль, дакуль адказныя колы ў Польшчы ня выракуцца такога вырашэньня польска-літоўскага спору, пры якім захісталася б раўнавага ў Усходняй Эўропе“. Дзеля таго, Радавы Саюз будзе асабліва ўважна сачыць за ходам выпадкаў. Радавы ўрад будзе надалей з усей энэргіяй працаваць для ўтрыманьня міру на Усходзе Эўропы.

Зачыненьне сэсіі ангельскага парляманту.

22 сьнежня ангельскі кароль ўрачыста зачыніў сэсію парляманту, прачытаўшы асабіста ў палацэ лёрдаў „тронавую прамову“.

У гэтай прамове даў агляд пасьпехаў ангельскай палітыкі за ўвесь мінулы год. Кароль сьцьвярдзіў палепшаньне прыязных стасункаў з Францыяй, памысны рэзультат перагавораў з Эгіптам. Прамова караля асабліва падчыркнула „працу Лігі Нацыяў дзеля ўкрапленьня сусьветнага міру“. „Цяжка было каралю памірыць гэтыя камплімэнты Лізе Нацыяў за яе „мірную працу“ з адмовай Англіі ад паразуменьня з Амэрыкай у справе разбраеньня на моры. Але — ці-ж Чэмберлен, які пісаў гэтую „прамову караля“, ня ведаў, як выкруціцца і тут.—Дык — кароль „з жалям“ сьцьвярдзіў — „непасьпех разбраенчай канфэрэнцыі“, але заявіў тут-жа, што гэта зусім не перашкаджае Англіі самахоць—.абмяжаваць праграму далейшай разбудовы ваеннага флёту, маючы на мэце толькі абарону раскіданай па ўсяму сьвету вялізарнай Брытанскай Імпэрыі“...

У канцы агляду палітыкі свайго ўраду кароль указвае на вялікае значэньне для ўкрапленьня сілы Імпэрыі адбыўшайся ў мінулым годзе „канфэрэнцыі“ — губэрнатараў, камісараў ды іншых прадстаўнікоў ангельскай улады ўсіх 26 калёніяў і мандатавых краяў, а таксама—на важнасьць пакліканай урадам камісіі дзеля апрацаваньня новага пашыранага статуту—аўтаноміі Індыі.

Рэзультаты кангрэсу камун. партыі СССР.

20 сьнежня закончыў працу XV кангрэс камуніст. партыі СССР. Нова-выбраны Цэнтральны Камітэт лічыць 71 асоб — на 9 больш, як папярэдні. Цэнтральная Кантрольная Камісія лічыць 195 сяброў, больш на 32, як папярэдняя. З нова-абраных сяброў Ц. К. —найвыдатнейшыя: Крупская (ўдава па Леніну), Мензынскі (галава Г. П. У., паляк), Скрыпнік, Чубар, (украінцы). Нявыбраны ізноў Орджонікідзе. У Палітычнае Бюро („галоўка“ партыі) ўвайшлі—Бухарын, Варашылаў, Калінін, Молатаў, Рыкаў, Рудзутак, Сталін, Томскі і Куйбышаў. На становішча генаральнага сакратара партыі ізноў выбраны Сталін. Прынята пастанова—склікаць агульныя зьезды партыі ня менш, як раз у два гады. Група выключаных з партыі павадыроў апазіцыі, у лічбе 23, падала заяву аб жаданьні вярнуцца ў партыю, адмаўляючыся ад усіх сваіх паглядаў, розных з бальшавіцкай. Але кангрэс—адмовіў ім у іх просьбе. Рыкаў, зачыняючы кангрэс, заявіў, што гэтая заява будзе разгледжана не раней як праз поў-года пры ўмове адпаведнага паводзеньня апазіцыі. У працiўным выпадку процi апазіцыі будуць прымацца меры, як супроць контр рэвалюцыянэраў.

Кабета—старшынёй аўстрыяцкага „Сэнату“.

На пасяджаньні 20 сьнежня „Саюзнай Рады“ Аўстрыйскай Рэспублікі выбрана была старшынёй кабета дэлегатка Штырыйскага Сойму Вольга Зэінэк. Гэта—першы выпадак гэтага роду ў Аўстрыі, дый выклікаў вялікі інтарэс у-ва ўсім краі. Пэўне-ж—цікаўна гэта і нашым кабетам.

Францыя з Польшчай, Італія з Літвой...

Вельмі цікаўная—у зьвязку асабліва з гэтымі рэвэляцыямі радавай прэсы — вестка ідзе з Коўны—аб тым—што да часу ўрэгуляваньня ўзаемных адносінаў паміж Літвой і Польшчай Францыя згадзілася прадстаўляць польскія інтарэсы ў Літве, Італія—бараніць літоўскія інтарэсы ў Польшчы.

Характэрныя „водгукі“ польскіх імкненьняў у францускай прэсе.

Можа яшчэ лепш, як з польскай прэсы, можна даведацца аб запраўдных імкненьнях ды жаданьнях польскай палітыкі ў справе Літвы,—з прыязнай да Польшчы—францускай прэсы... А калі прыпомніць, што, як агульнае правіла, з вельмі рэдкімі выняткамі, уся француская прэса наагул зьмяшчае артыкулы, як кажуць „інспіраваныя“, ці — прасьцей: замоўленыя, ці—яшчэ выразьней: заплочаныя заінтарэсаванай стараной, дык тады так-званая „публічная апінія“ Францыі ў справе польска-літоўскага спору зробіцца яшчэ яснейшай...

Француская прэса ў апошні час страшэнна ды непрыхаіта лае Вальдэмараса за тое, што ён... бароніць інтарэсы свайго краю процi Польшчы. Некаторыя францускія газэты проста заяўляюць, што—„адзіны шлях, якім Літва можа „здабыць“ сабе Вільню, гэта—далучыцца да Польшчы, якой частку яна станавіла ўжо праз некалькі вякоў“...

Пэўне-ж — польская прэса можа сабе зычліва маўчаць: за яе лепш—бо-ж аўтарытэтней—гавора француская...

Польскаму скарбу толькі прыходзіцца плаціць рахункі за францускія „публікацыі“ —трэба думаць, даволі значныя...

Сэнсацыйныя весткі аб пераглядзе „пляну Доўса“.

Можна думаць, што нарабіўшы такога галасу „даклад Паркера“, міжнароднага агента ў справе спагону адшкадаваньняў з Нямеччыны, які востра крытыкаваў фінансавую гаспадарку нямецкага ўраду, быў зроблены ды рэклямаваны... у бліжэйшым паразуменьні з нямецкім урадам... Нямеччыне перадусім ідзе аб тое, каб нарабіць галасу наагул навакол гэтага цяжкога для яе „пляну Доўса, які яна хоча „перагледзець“... Як ведама, француская прэса страшэнна накінулася на нямецкі ўрад за гэтую думку яго, якая пагражае... „здароўю францускіх фінансаў“...

Але—найбольш цікаўна, што ў Англіі імкненьні нямецкага ўраду выклікаюць спачуцьцё ды падтрыманьне. Як сьведчыць карэспандэнт „Кур. Варш.“,—у лёнданскіх палітычных колах лічаць „мэмарыял“ Паркера за першы крок на шляху да перагляду пляну Доўса. Спадзяюцца, што нямецкі ўрад хутка пасьля гэтага мэмарыялу выступіць з выразным дамаганьнем перагляду, прадставіўшы з свайго боку новы плян сплаты адшкадаваньняў. І вось, — становішча ангельскага ўраду—вельмі прыхільнае да нямецкіх імкненьняў... Можна прадбачыць, кажа карэспандэнт, што ангельскі ўрад—у тым духу будзе працаваць у Парыжу, дзе існуе рашучы спраціў процi якой-бы ні было рэвізіі пляну сплаты адшкадаваньняў...

Як бачым, „прыязны“ да Францыі ангельскі ўрад нічога ня мае процi таго, каб францускія фінансы страцілі сваё „здароўе“, якое маюць толькі — коштам нямецкага народу...

Справа ў тым, што ад 1 верасьня 1928 г. Нямеччына мае ўжо рэгулярна плаціць па два с паловай мільярды залатых марак у год гэтай ваеннай кантрыбуцыі, якая страшэнным цяжарам ляжа на карк нямецкага народу дый зусім няведама яшчэ, ці захоча нямецкі працоўны народ пакутаваць за грахі свайго кайзэрскага ўраду, калі не казаць вярней—за праступленьні сусьветнай імпэрыялістычнай буржуазіі, якая накінула народам страшэнную вайну...

Больш паловы з гэтай сумы—бо аж 52 прац. — будзе штогодна атрымліваць Францыя, каб падтрымліваць „здароўе сваіх фінансаў дый сплачываць свае ваенныя даўгі Англіі і Амэрыцы, а таксама—утрымліваць—на грошы нямецкага народу—вялікую армію, забясьпечываючы ёй ваенную дыктатуру ў Эўропе, а перадусім—трыманьне пад жалезным ботам таго-ж самага нямецкага народу... Ізноў-ж зусім няведама—ці згодзіцца нямецкі народ на даўжэйшы час знасіць гэткую агідна недарэчную паняверку... Амэрыка і Англія добра разумеюць, што на далейшы час гэткая недарэчнасьць утрымана быць ня зможа. Пачынаюць разумець гэта і ў Францыі, але яшчэ вельмі цяжка... Пуанкарэ разумее, што ўся яго праца над „санацыяй“ францускіх фінансаў паляціць далоў — без нямецкай кантрыбуцыі... Гэта сьведчыць аб тым, што „перамога Францыі“ ў вайне задала „пераможніцы“ сьмяротны ўдар, ад якога яна сваімі сіламі вылячыцца ня здолее...

Францускія палітыкі разумеюць, што трэба пайсьці лепш ізноў на далейшыя ўступкі Нямеччыне, каб атрымаць ад яе хаця што-нябудзь. Але яны трэбуюць, каб — за гэтыя ўступкі з боку Францыі на карысьць Нямеччыне зрабілі Францыі ўступкі ў сплаце ваенных даўгоў — Амэрыка і Англія...

Але Амэрыка на гэта заяўляе, што яна—не прызнае ніякай сувязі паміж нямецкімі сплатамі Францыі і францускімі даўгамі Амэрыцы...

Дзеля таго француская апінія страшэнна занепакоена пераглядам справы адшкадаваньняў, якая выдаецца неадхільнай, але — нясе Францыі вялізарную небясьпеку — банкруцтва...

— „Што пан сабе захочаце?“—пытаўся машынальна лёкай, павесіўшы пальто Загорскага і яго дамы на вешалку.

Загорскі заказаў сабе вячэру з каньяком.

— „А пані што?“—зьвярнуўся лёкай да дзяўчыны.

Дзяўчына зьмяшалася і сама ня ведала, што ёй адказваць. З гэтага прыкрага палажэньня выратаваў яе Загорскі, загадаўшы прынясьці тую-ж самую вячэру і для яе.

Вячэра і каньяк неўзабаве былі пададзены. Партнэрка Загорскага, на яго дзіва, ад каньяку адказалася, але затое з апэтытам і прагавітасьцю галоднага ваўчаняці накінулася на вячэру, зьядаючы яе да апошняй драбінкі.

— „Можа, пані вып'еш шклянку гарбаты?“—спытаўся Загорскі ў дзяўчыны, бачучы, як смачна і здаволена аблізвала яна свае вусны, пасьля толькі-што зьедзенай вячэры.

— „Дзякую,—да гарбаты я ня прывыкла“... адказала яна яму і схамянуўшыся, што сказала тое, чаго ня трэба было казаць, пачырванела, як макавы цьвет.

— „Як та пані да гарбаты ня прывычная?“ спытаўся зьдзіўлена Загорскі.

Дзяўчына пачырванела яшчэ болей і патупілася. Відаць было, што гэтае пытаньне закранула самы інтымны, самы балючы куток усяго яе жыцьця, куток, які яна хацела-б схаваць як найдалей ад вока чужога чалавека.

Загорскі інстынктыўна пазнаў і адчуў гэта, а сароміліваcьць, з якою гэта дзяўчына хавала гэту бязумоўна трагедыю свайго жыцьця, дадавала ёй яшчэ больш цаны і вартасьці. Штосьці прыемнае, роднае, цёплае агарнула, абвеяла і пацягнула яго да гэтай дзяўчыны, пацягнула не як мужчыну да жанчыны, а як чалавека да чалавека, як прыяцеля да свайго слабейшага і малодшага таварыша.

Выпіўшы п'яны, устаў ён з свайго крэсла, прайшоўся разоў некалькі па цесным пакойчыку, затрымаўся ззаду ў дзяўчыны і пачаў да яе прыглядацца, сілючыся штосьці прыпомніць. А тая, адчуўшы гэты праніклівы пагляд, счырванела яшчэ больш.

— „Адкуль пані родам?“—спытаўся ён ціха:

— „Што пану за інтэрас да ўсяго гэтага“?.. адказала яму горда дзяўчына, устаючы з месца.

І дзіўная справа: пачуўшы гэты горды адказ, Загорскі раптам уздрыгнуў усім сваім целам і, як шалёны, схапіў дзяўчыну за руку.

— „Наталька, ты!..“ ускрыкнуў ён, трасучыся ад радасьці.

— „Янка“!.. усхліпнула ў адказ дзяўчына і ўпала яму на рукі.

— „Дзе тата, мама дзе, дзе меншыя, дзе Маруся, Васіль?“ пытаўся Загорскі, тулячы да грудзей сваіх родную сястру. „Вязі мяне хутчэй да іх!..“ ускрыкнуў ён ізноў, схапіўся за галаву і, бясьсільна асунуўся на канапу, заплакаў, заплакаў чыстымі, гарачымі сьлязамі жалю, сьлязамі адраджэньня—ён ужо без адказу ведаў, дзе яго бацька—гэта яна сказала яму голасна, зычна ў часе маніфэстацыі, калі, як шалёная, кідалася да вастрожнай брамы, не зважаючы ані на штыкі, ані на вінтоўкі...

Загорскі плакаў сьлязьмі жалю, Наталька плакала сьлязьмі радасьці, што знайшла свайго брата, якога іхняя сям'я даўно ўжо аплакала, як забітага ў сусьветнай вайне. І дзіўнае здарэньне: кволая дзяўчына перамагла свой плач перш і перш запанавала над сваімі нэрвамі.

— „Янка, га Янка, чаго ты плачаш?.. Перастань!.. На вось выпі лепш троху каньяку і супакойся...“ усьцішала яго дзяўчына.

— „Ах, Наталька, Наталька!.. Я ня варт, каб ты мяне супакойвала, да мяне датыкалася сваімі рукамі“.

— „Чаму“?

— „Глядзі“... прагаварыў ён у адказ, сьціраючы пасьпешна, намочанай насаткай пудру з свайго левага віска.

— „Дык гэта ты хацеў мяне арыштаваць у часе маніфэстацыі ля вастрогу?!“ пыталася зьдзіўлена дзяўчына, ўсплёскваючы рукамі.

— „Я, Наталька“, адказаў ёй ціха Загорскі і зноў заплакаў.

— „Ну і чаго-ж ты расплакаўся як баба“—супакойвала яго Наталька. „Табе-ж гэрай бакі баляць, як мне“.

Словы гэтыя нарэшце наскуткавалі, і Загорскі павольі пачаў супакойвацца.

— „Наталька, якім спосабам ты папала на вуліцу?“пытаўся ён, пасадзіўшы сястру побач з сабою на канапе.

— „Надта проста“—адказала яму дзяўчына“. У Саратаве прабылі мы аж да дваццаць першага году. Жылі на тэй самай кватэры, з якой цябе забралі ад нас у салдаты. Жыць было ўжо надта страшна—быў голад, жылі аўсом ды мякінай; восень мы і паехалі дамоў. Дома мы апынуліся голыя, як стой— ні хлеба ні грошы, ні адзежы, ні дрэва на будоўлю. А з гэткім запасам на нашай парытай акопамі дзесяцінe не разгуляешся. Тата рашыўся ехаць у горад, і мы апынуліся ў Кішанёве. Спачатку так-сяк трымаліся: тата служыў на чыгунцы, а мы з Васілём вучыліся; але пасьля тату, як украінца, звольнілі са службы. Доўга кідаўся тата і сюды і туды, шукаючы працы, але найсьці яе нідзе ня мог, бо было надта многа безработных і нам узноў прышлося „класьці зубы на паліцу“. Голад аднак ня цётка і, каб ратавацца ад галоднай сьмерці і дабіцца якой дапамогі, рашылі безработныя устроіць дэманстрацыю. Дэманстрацыя гэта не ўдалася. Тату заарыштавалі...

„Даведаўшыся аб татавым арышце, мама сплакалася і захварэла; захварэў таксама і Васіль. Засталіся здаровымі толькі мы з Марусяй.... Ну я і мусіла ратаваць і сябе і іх ад голаду і холаду...

— „А як маецца мама цяпер?.. Папраўілася?“ спытаўся задыхаючыся Загорскі.

— „Дзе там!.. Памёрла“, прагаварыла ціха дзяўчына і пачала выціраць з вачэй сьлёзы.

— „Мама памёрла з голаду, тата ў вастрозе, сястра на вуліцы!.. сястра праститутка!.. А я?.. я—верны стораж!..“ — ускрыкнуў Загорскі, бы шалены вар'ят, хапаючыся за галаву рукамі. „Я за некалькі марных лей выракся іх, пачаў іх сароміцца, ня даў ім навет свайго адрасу, не паведаміў, што хоць жыў, але верна вартую свайго бацьку... вартую сваіх суседзяў!.. Ха-ха-ха!.. Вартую так вартую!..“ і ён заліўся дзікім рогатам.

— „Янка, Яначка, супакойся“... угаварвала яго дзяўчына, тулячыся да яго ўсей сваей маладой істотай. „На вось выпі гарбаты“, гаварыла яна, хапаючы са стала халодную шклянку.

Загорскі прагавіта прыпік да шклянкі і духам апаражніў яе. Халодная гарбата яго асьвяжыла, цёплая ласка сястры троху супакоіла і ён паволі пачаў прыходзіць да розуму.

— „Наталька, даражэнькая, мілая, вязі мяне хутчэй да вас, вязі мяне да Маруські, да Васіля...“ гаварыў ён, як ня прытомны.

— "Супакойся, пасьпееш, пабачышся... Я-ж думаю, ты ад нас ужо не ўцячэш больш, а застанешся з намі?..

— „Застануся“, прагаварыў ён радасна і ўскакваючы з месца, каб адзецца і ісьці хутчэй да брата і сястры.

— „Ура-а!.. Ура-а!.. Ура-а!.. нясьліся з салі п'яныя крыкі спатыкаўшых Новы Год.

Бам-бам-бам—біў гадзіньнік.

Загорскі аднак на іх не зьвяртаў увагі і пасьпешна апранаўся: ён пачаў свой Новы Год і звальненьня са службы ўжо не баяўся — у сваіх жылах ён чуў пралетарскую крэў.

Капітуляцыя Пяста.

21/XII. адбыўся пад кіраўніцтвам члена Галоўнай Управы Пяста Крыси зьезд старшынь гурткоў Пяста на абшарах 16 паветаў: Варшаўскага, Груецкага, Радзімінскага, Пултускага, Сахачэўскага, Блонскага, Скерневіцкага, Серпецкага, Рыпінскага, Беластоцкага, Гаволінскага, Цеханоўскага, Левіцкага, Седлецкага, Нешавскага і Плоцкага. Пасьля доўгай дыскусіі капітуляваў перад санацыйным урадам Пілсудскага ўвесь гэты масыў Пяста. Зьезд прыняў пастанову поўнага падтрымальня ўраду „санацыі“, асудзіў усю палітыку Галоўнай Управы Пяста і асабліва самога Вітаса. Пастаноўлена ў бліжэйшым часе выпусьціць адозву. У канцы выбраны Выканаўчы Камітэт аб'яднаных гурткоў Пяста.

Як паведамляюць газэты, пад націскам вынікаў гэтага зьезда скапітуляваў поўнасьцю і сам Вітас.

У Тарнове адбыўся зьезд паслоў і людзей даверыя Пяста. На гэтым зьезьдзе пасол Дубель высунуў праект падтрыманьня акцыі „Народнага Аб'яднаньня“, якой кіруе б. сэн. Бойка. Пасьля, (як звычайна бывае) доўгай дыскусіі Вітас даў на гэта сваю згоду. „Narзód“ дадае, што на гэтай канфэрэнцыі Вітас заявіў, што аддае сябе ў поўнае распараджэньне Бойкі, жадае супрацоўніцтва з урадам і на выбарах жадае выступіць у ўрадовым блёку.

Вітас завярае, што ў разе патрэбы гатоў зрачыся сваей кандыдатуры і выйсьці з палітычнага жыцьця. У гэтай справе адбылася сьпэцыяльная канфэрэнцыя з прадстаўнікамі ўраду пры пасярэдніцтве пасла Дубеля і сэнатара Сьціборa. Вітас, як паведамляе прэса, чакае на вынікі гэтых перавыбараў. Вось якім вынікам кончылася барацьба за польскае кулацтва між буйным фінансавым капіталам і абшарніцтвам (санацыя)—з аднаго боку і дробным мяшчанствам і лёгкай прамысловасьцю—з другога (Хадэцыя Эндэцыя і інш).

Капітуляцыю Пяста трэба лічыць аднэй з буйнейшых перамог Пілсудскага, якія ён атрымаў у астатні час на шляху ўмацаваньня сваей санацыйнай дыктатуры, на шляху касалідацыі буржуазных элемэнтаў Польшчы.

Наша хроніка.

Канфіската аднаднёўкі „Новагодняя Праца“. Па загаду Камісара Ураду канфіскавана аднаднёўка „Новагодняя Праца“ за наступныя артыкулы: „За год“, дзе быў пададзены агляд беларускай палітычнай працы за мінулы год, „Агульны Зьезд прадстаўнікоў Т-ва Беларускае Школы“, і чатыры карэспандэнцыі: „Культурна-асьветная праца паліцыі“, „З іншае опэры“, „Катаваньні ня спыняюцца“, „Ігра ў кіёк, які мае два канцы“. Рэдактар М. Баровы цягнецца да адказнасьці.

Зьезд прадстаўнікоў Т-ва Беларускай Школы. 28—29 сьнежня адыйшоўшага году ў салі Народнага Дому Т-ва (Вільня, вуліца Сьв. Ганны 2—3) адбыўся зьезд Т-ва. Лік прысутных з правам рашаючага голасу па вымаганьнях дасюль абавязваючага статуту — 68. Апрача таго, быў даволі значны лік прысутных гасьцей з правам дарадчага голасу.

Парадак зьезду:

1) Прывітаньні;

2) Агульны даклад аб працы Т-ва за мінулы час — дакладчык грам. І Савіцкі;

3) Даклад аб школьнай асьвеце—дакладчык грам. Р. Шырма;

4) Даклад аб пазашкольнай асьвеце — дакладчык грам. Я. Шнаркевіч;

5) Даклад аб фінансавым палажэньні—дакладчык грам. Кэпель;

6) Даклад Наглядная Рады — дакладчык грам. К. Крук.

7) Удзяленьне Абсолюторыуму Галоўнай Управе;

8) Даклад з месц;

9) Выбары новай Галоўнай Управы;

10) Даклад аб пляне працы на будучыню;

11) Зьмена статуту і

12) Бягучыя справы.

Новая Галоўная Управа выбрана ў наступным складзе: Р. Шырма, Шнаркевіч, д-р І Дварчанін, М. Кэпель, д-р М. Марцінчык, В. Грышкевіч, І. Савіцкі, М. Пяткевіч, А. Трэпка, А. Уласаў, А. Кізевіч, (Горадня) Валынец, (Вялейка). Заступнікі — М. Сіняўскі, Стэцкевіч, (Радашкавічы) М. Дылька, (Косава) д-р Я. Станкевіч.

Наглядная Рада — К. Крук, А. Лябецкая (Слонім), Я. Карп, У. Манкевіч і І. Мятла.

Падрабязьнейшыя інфармацыі падамо ў наступным нумары.

Вялейка—Вільні. 29-га сьнежня м. г. пасьля зьезду Т-ва Бел. Школы ў салі Народнага Дому адбылося прадстаўленьне тэатральнай трупы пры Вілейскай Акружной Управе Т-ва Бел. Школ, пад кіраўніцтвам артыста А. Каляды. Адыграны былі—„Птушка шчасьця“ і „Вывядзьвіньне“ (пераробка з украінскага сіламі самой трупы). Выступленьне вялейцаў зрабіла на віленскую публіку, як асабліва прыехаўшых з правінцыі сяброў Т-ва Бел. Школ, вельмі прыемнае ўражаньне. Асабліва мела вельмі прыемная гра іх, у якой у ролі панікмара, артыст А. Каляда выказаў проста памастацку. Другія артысты таксама паказалі сваю артыстычную здольнасьць.

Адным словам, вялейцы да зьезду прыгатавалі Вільні добры падарунак.

Сход Беларускага Выдавецкага Т-ва ў Вільні. У суботу, 31-га сьнежня 1927 г. адбыўся звычайны гадавы сход Беларускага Выдавецкага Т-ва. Са справаздачы высьветлілася, што Т-ва выдала былога 1927 году 24 новыя кніжкі, ня гледзячы на цяжкія варункі, у якіх працавала Т-ва.

У новы праўленьне Выдавецкага Т-ва выбраны: гр. гр. Трэпка, Дварчанін, Грышкевіч В., Станкевіч Янка і Шнаркевіч, кандыдатамі: Маразовіч і Паўловіч; у рэвізыйную камісію: гр. гр. Крук, Шалешчыха і Мэнке.

Акты абвінавачаньня б. б. паслоў. Як даведаліся жонкі б. б. паслоў у сэкратара Пракурора, які вядзе сьледзтва ў справе б. б. паслоў—не наважней, як праз два тыдні павінны быць паслом даручаныя „акты аскарженьня“ і магчыма ўжо ў Вільні, на Лукішках, куды маюцца прывязьці іх неўзабаве.

Як падае ўрадава-польская прэса, акт абвінавачаньня паслам Грамады ўжо падпісаны Пракурорам Пшылуцкім. Акт зьмяшчае 300 старонак матэр'ялу, друкаванага на машынцы, цягнучага да адказнасьці 56 абвінавачаных. Працэс адбудзецца праўдападобна 20 лютага.

З гэтай прычыны прышчэлі беларусаў „Kur. Wil.“ зьмяшчае ў сваім дадатку ілюстраваным фатаграфіі б. паслоў Тарашкевіча, Мятлы, Рак Міхайлоўскага і Валошына, а побач з імі зьмяшчае фатаграфію бандыты збойцы Азолевіча. І гэта робіць той сама „Kur. Wil.“, які калісь дзеля прыкладу зока „абураўся“ што грам. Астроўскага вязі ў Вільні разам з бандытамі. Паказваем, што Вы тыя самыя і не вымушаныя паказваць! А інфармацыі „Kur. Wil.“ так глыбокая, што б. пасла Валошына, які сапраўды сядзіць у Вронках — называе ён Рагуляй (да не ўсё-лі равно?!), які на волі і творыць разам з Ярэмічам блёк меншасьцяў, аб якім той-жа „Kur. Wil.“ піша што дня.

Адчытаньне сьледчага матэр'ялу паслом б. Грамады. У месяцы лістападзе прыяжджалі ўва Вронкі для адчытаньня сьледчага матэр'ялу з Вільні судзьдзі Паўлюць, Падоцкі і, здаецца, пракурор Пшылуцкі. Акты чыталіся ад 18/XI аж да 30/XI. Да гэтага часу ўсе заарыштаваныя ў справе Грамады ў-ва Вронках мелі права бачыцца па дзьве-гадзіны ў дзень, апрача супольнага дзьвох гадзіннага спацыру. Для азнаямленьня з сьледствам было пакінута тры экзэмпляры, па аднаму на двох чалавек, маючы на ўвазе іхняе права быць разам.

Аднак 7/XII гэтае права бачыцца на дзьве гадзіне ў заарыштаваных адняты. Яны падалі просьбу адміністрацыі аб прадоўжаньні ранейшага права. Начальнік турмы „абяцаў“ пагаварыць з судовымі ўладамі ў Вільні.

Вронкі. Як паведамляюць нас жонкі былых паслоў, стан здароўя пас. Тарашкевіча вельмі благі. Дзякуючы вільготнай цэлі, у якой навет не высыхае зраньня аж да самага вечара ручнік паважанага вязьня, праф. Тарашкевіч вельмі паважна захварэў на рэўматызм. Болі, зьвязаныя з гэтай хваробай, паважна перашкаджаюць яму ў працы. Ня гледзячы на гэта, ён і на далей пакідаецца ў тэй-жа самай цэлі. Вочавідкі пазбаўленьне волі правадыра беларускіх працоўных мас у працягу цэлага году бяз суда яшчэ не выстарчае, відаць, неабходна пазбавіць здароўя і зьнішчыць фізычна. Толькі гэтак можа зразумець гэтыя факты беларускае грамадзянства.

Таксама сільна падупаў на здароўі слабы на грудзі пасол Рак-Міхайлоўскі, пазбаўлены перавозам у Вронкі гэтак патрэбнай яго слабаму здароўю сталай апекі і помачы сям'і. Калі-ж скончыцца гэта! Ці-ж запраўды неабходна фізычнае зьніштажэньне гэтых людзей?!

„Гадовы юбілей“ у Вронкаўскай турме. Як нам пішуць, 14/XII—1927 г. ў Вронкаўскай турме гр. Акінчыц спраўляў „Гадавы юбілей“ свайго быцьця ў вастрозе. Як ведама, гр. Ф. Акінчыц быў заарыштаваны раней за паслоў, якраз 14/XII — 1926 г. ў часе работніцкай дэманстрацыі перад Лукіскаю турмою.

Гр. Ф. Акінчыц быў загадчыкам юрыдычнага Аддзелу Сэкрэтарыяту Грамады.

Прароцтвы віленскіх манархістаў на 1928 г. Віленскія манархісты вуснамі Cata ў сваім органе „Słowo“ прарочаць узмацненьне Польшчы ў 1928 г. Узмацненьне гэта будзе абасноўвана на санацыі, якую трымае ў сваіх руках Пілсудскі. Санацыя гэта, кажа Cat, яшчэ больш патрывае, а дэмакратызм разам з парлямантарызмам зусім падупадзе. Польшча ў 1928 г. стане побач з фашыстаўскай Італіяй (тады то і будзе хіба „вольнай з вольнай“. Рэд.), а Пілсудскі стане для Польшчы тым, чым для Італіі ёсьць Мусоліні. Абедзьве фашыстаўскія дзяржавы будуць падставай палітычнай дынамікі руху ў Эўропе, скірованай да „моцарствовасьці“.

Усё гэта зусім праўдападобнае і зразумелае, як зразумелым таксама зьяўляецца прадстаўленьне Cata аб лёсе меншасьцяў у Польшчы 1928 г. Ен кажа, што справа меншасьцяў у Польшчы ня вырашыцца ў 1928 годзе, бо ня знойдзецца між імі моцных груп, якія-б пайшлі на лёяльнае супрацоўніцтва з Польшчай (чытай: на поўнае падпарадкаваньне польскай буржуазіі. Рэд.). Дзяржава ж Польская зьяўляецца на стольківа моцнай у 1928 г., што, „не патрабуе старацца аб узышканьні сымпатыяў меншасьцяў“. Дык вось як выглядае адносіны Польшчы да меншасьцяў: пакуль Польшча моцная — меншасьці нічога не атрымаюць. Дык чаго ж наракаць тады на „антыпаньствовыя“ настроі сярод меншасьцяў? Кожны хоча жыць.

Але далей Cat прарочыць, што бегам 1928 г. „паўстануць нарэшце ўгадовыя групы ў адносінах да Польскай дзяржавы“. Ці інакш кажучы, узрастаючая рэакцыя зьнішчыць сапраўдныя нацыянальныя рухі сярод нацыянальных меншасьцяў.

Апэтыты гэтыя для нас зразумелыя, але ці так будзе пабачым.

Вядомы авантурнік на віленскім груньце Дзяргач-Адамовіч (Зялёны Дуб) герой у вачох расейскіх манархістаў. Парыжская манархічная газэта „Возрожданіе“ выхваляе аж пад неба ў перадавіцы Дзергача, пратэстуючы супроць зьмешаваньня Дзяргача з Адамовічам, якому закідаецца шпіонаж на карысьць бальшавікоў. Відаць „Возрожденія“ ня ведае, што Дзяргач-Адамовіч гэта тая-самая асоба, добра знаная на віленскім груньце.

Новыя працэсы камуністаў. Надовячы амаль-што адначасна былі выстаўлены працэсы камуністаў у Баранавічах, Ваўкавыску і ў Горадні—аж тры працэсы за раз.

У Баранавічах была разгледжана справа 7 камуністаў, як падае прэса, сяброў акругавага камітэту К. П. З. Б., абвінавачаных з 102 § К. К.

Як і заўсёды супроць камуністаў суд вынес суровы прысуд: А. Даяна засудзіў на 6 год катаргі, Гурвіча на 6 год, Аронсона на 6 г., Цыкорна на 4 г., Літвака на 2 г., Шарпіка на 2 г. і Брэўдуна на 1 г.

У Ваўкавыску судзілі 4 камуністаў, з якіх двух засудзілі па 4 г. і двух па 3 г.

У Горадні разглядалі справу Васіля Стрэнкі, абвінавачанага па 102 арт. К. К., Васіль Стрэнка, як сябра К. П. З. Б. і сэкрэтар акругавага камітэту Саюзу Камун. Моладзі ў Горадні—засуджаны на 3 гады.

Шыбеніца ў Беластоку. Згодна з новым загадам, прысуды сьмерці будуць выконвацца праз павешаньне. У зьвязку з гэтым у беластоцкім вастрозе пабудавалі шыбеніцу.

Абноўка беластоцкай шыбеніцы адбудзецца 5-га студзеня с. г., у гэты дзень будзе павешаны на ёй бандыт Сташкевіч.

Так вам і павераць. Курвіленцы цешацца, што на зробленым мітынгу новаспечанага „Zjednoczenia“ ў Ашмяне, сабраныя нібы „з асаблівым энтузіязмам прынялі вестку аб далучэньні ўсіх „народных“ (людовых) групаў у вадно ўгрупаваньне — „Zjednoczenie“ — ды ўрэшце аднагалосна „zgłosili akces“ да гэтага ўгрупаваньня. Гэта дае курвіленцам магчымасьць сказаць сьмела, што цэлы ашмянскі пав. пойдзе на выбары з „Zjednoczeniem“.

Чым бы дзіця ня цешылася, абы ня плакала — кажа народная пагаворка. Мы-ж пераканаяы ў зусім адваротным, а ласьне, што ў ашмяншчыне жыве такая-ж самая беднага, як і ў іншых паветах, а таму ня так ужо ахвочая галасаваць за паноў і „паўпанкоў“.

Партыя беспартыйных? Пан былы сэнатар В. Багдановіч, які цяпер для выбараў адчыніў сваю крамку пад назовам „Праваслаўнае беларускае дэмакратычнае аб'яднаньне“, у свае гутарцы з карэспандэнтам „Słowa“ паведаміў, што ў створаны буржуазны блёк нац. меншасьцяў уваходзіць таксама група беспартыйных работнікаў. Што гэта за група, ці партыя, ці шмат налічвае людзей — хіба толькі можа паведаміць „Сялянская Ніва“, як орган буржуазнага міжнароднага блёку?...

14-га сьнежня с. г. у Баранавічах вызначаная сэсія Навагрудзкага Акружнага Суда, разглядала справу з арт. 102 к. к. аб прыналежнасьці да Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі, якая мела на мэце шляхам аружнага паўстаньня адарваць Заходнюю Беларусь і далучыць яе да Радавай. Падчас працэсу застала сцьверджана, што ніжэйпаданыя асобы тварылі Акружны камітэт К. П. З. Б. у м. Баранавічах, дзеля чаго быў вынесены наступны прысуд: А. Даён 6 гадоў цяжкае турмы, Рэйза Гурвіч 6 гадоў, В. Аранзон 6 г., Н. Цыкорны 4 г., М. Літвак 2 г., Соня Шарнік 2 г., Хана Брэвда 1 г., ніводнаму з абвінавачаных ня быў залічаны той працяг часу, які яны сядзелі да суда.

17-га сьнежня разглядалася Акружным Судом на выязднай сэсіі ў Ваўкавыску справа 6-цёх грамадзян-беларусаў, абвінавачаных у камунізьме. Двох з гэтага ліку Міралюбава Уладзімера і Мялешку Анастаса з вёскі Міхалкі-Вялікія, Сьвіслацкае гміны, засудзілі кожнага на 4 гады цяжкага вастрогу, залічаючы ім на пачатак кары 11 месяцаў сьледзтва. Наступных двох: Сыраежка Хвёдара і Качка Кастуся з вёскі Качак, Сьвіслацкае гміны, засудзілі кожнага на 3 гады, дому паправы, залічыўшы ім па 9 месяцаў сьледзтва. Радзівон Антон, які быў на волі пад каўцыяй і Бакалач Янка, быўшы пад надзорам паліцыі, на суд не зьявіліся.

Адзін з засуджаных.

20.XII 27 г. Ваўкавыскі вастрог.

Адрыўны календар Беларускага Выдавецкага Т-ва. Як нас паведамляюць з Беларускага Выдавецкага Т-ва, прадажа Адрыўнога календара Т-ва на 1928 год пашла так хутка, што на складзе Т-ва ўжо цяпер астаўся ня значны лік яго.

Кнігарня Т-ва даводзіць да ведама, што паступіўшыя заказы выконваюцца па чарзе паступленьня, апрача тых, на якіх зусім ня чытэльны адрас на купоне, або не азначана, што належыцца выслаць. Дзеля гэтага кліентам, якія выслалі грошы і ў доўгі тэрмін не атрымалі заказу, прапануецца зьвярнуцца яшчэ раз у кнігарню, паказаўшы — калі былі высланы грошы і выразна напісаць свой адрас. Тым кліентам, каму ня стане календароў адрыўных, кнігарня заменіць на Календар-кніжку Т-ва Бел. Школы, калі гэтаму ня будзе ў час запярэчана.

Календары можна даставаць і ў кнігарнях пры Акружных Управах Т-ва Бел. Школы ў Слоніме, Вялейцы пав. і Навагрудку.

Выйшла з друку 10 кніжка „Саха“. Зьмест: Гутарка пра радиовую культуру збожжа. Першая дапамога пры ацёлу. Хваробы пасьля ацёлу. Здайваньне кароў пасьля ацяленьня. Цельня гарачка ў кароў (налярушш). Просты спосаб грэць ваду жывёле. Дагляд пчол у зімоўніку. Рыбная гаспадарка. Некалькі слоў пра мышэй. Як закладаць кааперату (спажывецкае Т-ва). Парады агранома. Паштовая скрынка.

Цана ад 2 нумару да канца году 2 зл. 25 грош. Адрэс: Вільня, вул. сьв. Ганны 2—3.

„МАЛАНКА“. 30-га сьнежня г. м. вышаў № 10 часоп. „Маланка“. Нумар багаты гумарам і актуальнымі карыкатурамі і наагул робіць добрае ўражаньне; пажаданы толькі некаторыя палепшаньні з боку тэхнічнага, як напр. друкаваць лепшай фарбай і больш стараннае выкананьне карыкатураў.

Распачацьце рэдакцыяй „Маланкі“ свае дзейнасьці, беларускае грамадзянства спаткала з вялікім здаволеньнем.

Абвестка. Навагрудзкая Акружная Управа Т-ва Белар. Школы падае да ведама гурткоў навету, што ёю пададзена просьба Навагрудзкаму старасьце аб дазвол на агульны зьезд, які мае адбыцца 16 га студзеня ў памешканьні гімназіі.

Парадак дня: 1) Справаздача за мінулы год, 2) Даклады з месцаў, 3) Перавыбары Управы і Наглядная Рады, 4) Падняцьце культурна-асьветнай працы на мясцох, 5) Бягучыя справы.

Навагрудзкая Акружная Управа
Т-ва Белар. Школы.

Да ведама грамадзянства м. Слоніма і ваколіцы. Тэатральная трупа Т-ва Беларускае Школы пад кіраўніцтвам грам. Міхалевіча скіроўвае сваю працу на правінцыю. Так на 8—9 студзеня трупа гэта мае быць у м. Слоніме, дзе думае наладзіць беларускі спэктакль. Пастаўлена будзе драма Фр. Аляхновіча „Страхі жыцьця“.

Прадстаўленьне з прыгодамі. 27 і 28 сьнежня адыйшоўшага году ў салі Інстытуту Гаспадаркі і Культуры—адбыўся прадвыбарны зьезд беларускага згодніцкага аб'яднаньня. Усё ішло добра, з трыбуны хвалілі свой буржуазны нямецка-жыдоўскі тавар, заверчаны ў бавоўну „любові да беларускага народу“, выстаўлялі дзіўную чысьціню беларускасьці (аб угодзе ані слова), кляймілі блюзьнерна беларускія працоўныя гушчы, якія пашлі проці іх—аж раптам парвалася.

На трыбуне б. пасол Сабалеўскі. Голае з месц пытае, ад імя якой арганізацыі ён выступае. На недарэчныя тлумачаньні раздаюцца крыкі—„Далоў! Здраднік“! і разам—„Няхай жывуць... (імяньняў не падаём, каб не наразіць газэту на канфіскату.—Рэд.).

Гэты кліч падхапляецца ўсім зьездам, адбіваючы настрой сялянскіх гушчаў і ствараючы запраўдны скандал для кіраўнікоў зьезду, якія пачулі, што сялянскія гушчы, навет тыя, хто прыбыў на зьезд—настроены яўна проці іх, а калі прыехалі, то таксама, як і на зьезд Паўлюкевіча—толькі дзеля таго, каб пабачыць за дармныя грошы Вільню, пабыць дарма на „прадстаўленьні“, а прыехаўшы дамоў, гаварыць і думаць аб Ярэмічах, Рагулях, розных Багдановічах ды Голадах тое, чаго яны варты.

„Сялянская Ніва“, пішучы аб гэтым здарэньні, пускае туман у вочы, гавора, што „грамадзянін, робячы закід, сам памыліўся, бо Грамада ня істнуе, а знача няма каго і здраджаць“.

Паночкі! Праўда—Грамада ня існуе і, як здаецца, ня ў здрадзе Грамадзе рэч. Ярэміч і Рагуля таксама не здраджалі сваей партыі, але што яны здраднікі беларускіх працоўных гушчаў—аб гэтым ведае хіба кожны, як таксама і аб іхніх кумпанох.

Другая прыгода трошкі іншага гатунку. На зьезд хацеў папасьці таксама і эсэр Мамонька. Калі ён, прастаяўшы над дзьвярыма некалькі гадзін, урэшце ўварваўся ў салю, то быў напатканы клічам Ярэміча: „а, дыфэнзыва“! Тут пры абапольных выкрыках аб здрадзе беларускага народу ў саюзе з польскай або з нямецка-жыдоўскай буржуазіяй—распачалася запраўдная бойка, аж пакуль Мамонька ня быў выкінены на сходы.

Відаць, кожны з „збойцаў“ лічыў сябе правым, калі свой пагляд даказваў такімі матарыяльнымі доказамі.

А панашаму дык—„абое рабое“.

Наагул-жа абедзьве прыгоды вельмі характэрныя, як для агентаў буржуазіі, так і ў сэньсе адношаньня да іх беларускіх працоўных гушчаў.

Звальненьне з Вронкаўскай турмы гр. П. Назарука. На гэтых днях прыехаў у Вільню звольнены каля месяца таму з Вронкаўскай турмы гр. Пілін Назарук, які быў заарыштаваны разам з пасламі і іншымі цэнтральнымі працаўнікамі б. беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады. Грам. Назарук працаваў у Юрыдычным Аддзеле Сэкрэтарыяту Грамады. Цяпер звольнены з яе без вялікшых высьненяў. Нібы яго справа мае быць „umorzona“. Выходзіць такім чынам, што чалавек бязьвінна прасядзеў 11 месяцаў, ня ведаючы свайго будучага лёсу, пад пагрозай навет „bezterminowego więzienia“, якое як-бы пагражае нашым паслам.

Здароўе гр. Назарука падупаўшае, выглядае даволі дрэнна, гаворыць неахвотна. Грам. Назарук адведаў 29 сьнежня вечарыну, якую ладзіла для вучасьнікаў адбываючагася зьезду Т-ва Бел. Школы, трупа Вялейскай Акружной Управы і быў шчыра вітаны прысутнымі.

Далейшыя інфармацыі аб стане здароўя і аб жыцьці ўва Вронках — чытачы дастануць у наступныя дні.

З Т-ва Бел. Школы.

Культурная праца гуртку Т-ва Беларускага Школы.

Дня 18 сьнежня с. г. у м. Сьвіслачы адбыўся сход гуртка Т-ва Бел. Шк.

На заканчэньню спраў, пастаўленых па парадку дзенным сходу, прысутныя прынялі наступні рэзалюцыі:

1) Мы, прысутныя на сходзе, дамагаемся адчыненьня ўрадовых беларускіх школаў, згодна уставы з дня 7. IV. 24 г. і уст. як. з дня 7. VI 24 г.

2) Дамагаемся адчыненьня ўрадовых вучыцельскіх беларускіх сэмінарыяў.

3) Дамагаемся адчыненьня ўрадовых бел. гімназіяў і перапрацаваньня ўжо існуючых прыватных у ўрадовыя.

4) Пастанаўляем за абавязак кожнага сябры Гуртка шырыць культурна-асьветную працу Т-ва.

Матэр'яльна і маральна падтрымліваць усе установы яго, як бібліятэкі-чытальні, народныя дамы і г. д., ведаючы, што у моцнай эканамічна арганізацыі ўсе пастулаты нашага статуту будуць выканаваны.

5) Дбаючы аб пашыраньні роднай літэратуры, сход пастанаўляе знайсьці сродкі выдаць ўласным коштам кніжку з заканчэньнем выдавецтва Сьвіслацкага Гуртка Т-ва Бел. Шк.

6) Бяручы за прыклад гісторычныя надзеі былых паняволеных народаў, як Чэхаў, Літвіноў і іншых і іх грамадзкую ахвярнасьць на справу сваёй культуры, сход зварачаецца да беларускага грамадзянства з шчырым заклікам аб будаваньні роднай асьветы і культуры, аб арганізацыі густой сеткі культурна-асьветных гурткоў і хаўрусоў, маючых на мэце праўдзівую дапамогу ў культурным сэнсе, аб матэр'яльным падтрыманьні і шырэньні такіх.

Памятайма браты, што ахульны дабрабыт наш будзе залежыць ад высокасьці нашага культурнага роўня.

Уневажняецца Сяброўскія білеты выдания на імя 1) Гаўрусёва Міхала № 5091, 2) Міхальчыка Зьмітрака № 5093 з в. Старажоўшчына, Косаўскага пав. 3) Качаноўскага Кастуся № 882, 4) Гайдучка Аляксандра № 3605 і 5) Кузьміна Сяргея № 3510 з м. Сьвіслачы, Ваўкавыскага пав.

Ахвяры на карысьць незаможных вучняў.

1) Ахвяры сабраны— Косаўскай Акружной Управай—18 зл. 95 гр.— 2) ад Стралецкага Гуртка Т-ва Бел. Шк. Гарадзенскага пав.—16 зл.—3) ад грам. Фіхіповіча Вацлава з в. Агірауцы, Браслаўскага павету—2 зл.— 4) ад Гуртка Т-ва Бел. Шк. у в. Сялец, Лідзкага пав.—42 зл. 70 гр. Усім ахвярадаўцам шчырая падзяка і сяброўскае прывітаньне.

Галоўная Управа.

З жыцьця Гарадні.

Працэс „Г". Дня 6 сьнежня с. г. у Гарадзенскім Акружным Судзе разглядалася палітычная справа Васіля Стрэшні, якога абвінавачвалі з арт 102 (царскага) кодэкса, як сэкратара Гарадзенскага Акружнага Камітэту Камуністычнага Саюзу Моладзі Заходняй Беларусі. З боку сьведкаў была наяўлена ведама правакатарка Надзея Шушкевіч, якая на судовай расправе сьцьвердзіла прыналежнасьць яго да К. П. З. Б. На тайнай нарадзе суд выдаў прысуд, на падставе якога Васіль Стрэшко застаў асуджаны на 3 гады дому папраўы.

Нарэўны.

Лісьмо у Рэдакцыю.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

У зьвязку з весткай, надрукаванай у „Слове" № 298, прашу надрукаваць, што я ніякай асобнай лісты кандыдатаў у Сойм і Сенат дагэтуль не тварыў і аб гэтым ня думаў.

З пашанай

А. Мітковіч.

Дня 31. XII. 27 г.
г. Баранавічы.

Красамоўны крок.

(З Баранавіч).

У Баранавічах ад якіх месяцаў пяток існуе „Прасьвета" Паўлюкевіча, каторы на кіраўніка яго купіў аднаго хлапца... ім ёсьць Шулейка! каторы атрымоўвае на 60 зл. у месяц. Аднак, як ведама, да Паўлюкевічавай арганізацыі далучыліся і Рагуляўцы, як б. сэн. Назарэўскі і Яроцкі, дык вось нешта такое здарылася, што Шулейка ўжо за адно пачынае тут закладаць і арганізацыі Рагулі-Ярэміча.

Красамоўная дзейнасьць! С.

І паштары зьдзекуюцца.

(Пошта Тэлеханы, Косаўскага павету).

На нашай пошце прападаюць газэты, напр. газэты: „Наша Праўда" я не атрымаў апошніх шэсьць нумароў, якія ня былі сканфіскаваны. Апошнімі часамі газэта ўжо трохі менш прападае, але паштары доўга прадзержваюць яе на пошце, а як прыйдуць на пошту польскія, жыдоўскія, або „За свободу", дык „нашы" паштары разьбіраюць і адразу аддаюць. А газэта: „Права Працы" кідаецца на бок, там мусіць праляжаць з тыдзень, калі ня два. А наш селянін ідзе ў сьцюжу на газэтку за вёрст 8, а то і больш і, не атрымаўшы нічога, варочаецца дамоў ні з чым, у той час, як газэты спакойна ляжаць на пошце.

Чаму гэткая наша доля?

Я. Несьцярпеўшы

Зладзейскія ўчынкі.

(Вёска Азіраўцы, Браслаўскага павету).

У апошнія часы, мы не атрымліваем амаль зусім нашае газэты. Гэтак мы не атрымалі 1-га, 2-га, 5 га, 6 га, 7-га, 9-га, 10-га і далей, нумароў „Працы". З пачатку мы ня ведалі, дзе падзяюцца нашыя газэты, але вось цяпер даведаліся. Справа ў тым: Нядаўна, прэнумаратар „Працы", Антон Сіротка, спаткаў у м. Браславі возьнага Браслаўскага Староства, Вінцуся Баровіка, які зьвярнуўся тады да Сіроткі з наступным пытаньнем:

— „Ці цябе яшчэ не арыштавалі"?

— За што? — спытаўся А. Сіротка.

— „Я ня ведаю, за што", — адказаў возьны. В. Баравік — „Я толькі думаў, што ты арыштаваны, бо бачыш, я толькі што быў у пастарунку і бачыў там, на стале, тваю газэту, дык я і падумаў, што калі твая газэта на пастарунку, дык мусіць і ты арыштаваны".

Дык вось, якім чынам мы даведаліся, дзе падзяецца нашая газэта, нашая ўласнасьць.

Як ведаем, што ў Рэчыпаспалітай Польскай, згодна з законамі, ніхто ня мае права, забіраць чужую ўласнасьць, тым болей ня маюць права, нам здаецца, тыя, якія зьяўляюцца „стражамі" праважондпасьці ў Рэчыпаспалітай Польскай. Дзеля таго мы маем поўнае права дамагацца ад вышэйшае ўлады, пакараць урадоўцаў пошты і паліцыю ў м. Браславі, за захоп чужой уласнасьці.

Чытач „Працы".

Перавыбары гміннай рады.

(Мжавіцкая гміна, Слонімскага павету).

Дзеля таго, што зьмяніліся граніцы нашай гміны (гэтак казала нашае гміннае начальства), а менавіце: вёска Плаўскія з шляхоцкім насельніцтвам адыйшла да суседняй гміны, у нашым самаўрадзе адбыліся новыя выбары. Выбаршчыкаў па абводам выбіралі 26 кастрычніка, а амаль не праз 2 месяцы (13 сьнежня), выбіралі гміную раду, у склад якой увайшлі 6 беларусаў з сялянска-работніцкай ідэалёгіяй, 4 шляхціцы і 2 беларусы з ідэалёгіяй „куды вецер дуе".

Падаючы да ведама нашага шматпакутнага насельніцтва пра перавыбары самаўраду Міжавіцкае гміны, хочацца не прамінуць і тых перашкод, якія ставіліся пры выбарах, і тых баламуцтваў гміннае выбарчае камісіі, і нарэшце, тых пагрозаў з боку Слонімскага старасты. Пры вызначэньні выбаршчыкаў на абводам, гэтыя апошнія назначаліся ў меншых вёсках, дзе пераважна менш сьвядомых беларусаў, або дзе насельніцтва шляхоцкае, як напрыклад: вёска Крывец, сама маленькая, жыхары — шляхта, куды прыйшлося йсьці ў дрэнную нагоду дальвём вялікім вёскам Остраву і Махначам. У гэтым-жа абводзе беларусы пацярпелі паражэньне, даўшы шляхце 4 мандаты. Шляхта абдурыла два разы: першы раз тым, што правяла выбары раней вызначанай гадзіны, на што остраўцы і махначане пратэставалі, а калі былі другія выбары, дык з вёсак Вострава і Махначы зьявілася толькі 57 чалавек, а шляхта, сабраўшы ўсіх і сьляпых і крывых і шляхцянак з шляхцюкамі, узяла верх. Браты-гаротнікі, мужычкі вясковыя, няхай гэтага больш ня будзе! Няхай будзе нам за навуку, што, калі дзе якія выбары, дык усе ад маладога да старога, ад гарбаценькай бабулькі да дзяўчыны-красулькі, але прэце на выбары! Насьжа многа, і мы павінны валадаць!

На гмінным сабраньні, дзе быў прысутны і Слонімскі староста, гмінная выбарная камісія бяз жадных довадаў выкінула за дзьверы 5 чалавек выбаршчыкаў, сказаўшы, што яны маюць справу па 129 арт. К. К. Пацярпеўшыя напрасілі даць выясьненьне, але не пасьпелі яны закончыць пытаньня, як паліцыя, па загаду войта, ужо выштурхнула іх за дзьверы. Пазбаўленыя сябры валаснога сходу ніякусенькай справы ня маюць, хіба толькі, што былі грамадаўцамі. Два з іх былі выстаўлены кандыдатамі на радных на беларускаму сьпіску.

Нарэшце, перад выбарамі і пасьля выбараў Слонімскі староста прыказаў, каб новая рада не займалася палітыкай, каб слухала начальства, каб была лёяльнай да ўлады, каб... ня вывешвала чырвоных сьцягаў, бо тады, ох тады — паліцыя, пракурор, суд, турма і г. д.

Ня гледзячы на ўсе вышэй пералічаныя перашкоды, баламуцтвы, пагрозы, наша гмінная рада складаецца з большасьці беларусаў, ад якіх спадзяёмся творчай працы на карысьць працоўных мас, калі іхноў ня знойдуць прычыны да яе разьвязаньня. А чуткі ўжо ёсьць, што і новая рада не доўгавечна. Сам Чалей — войт гміны — казаў націхоньку, што маюць да нашай гміны прылучыць новыя вёскі ад другіх гмінаў, а з гэтым і перавыбары. Дык, калі-б гэтыя чуткі зьдзейсьніліся-б, не давайцеся, браточкі, каб вас баламуцілі, выкідалі! Усе дружнаю сям'ёю прэце на выбары, выбірайце людзей, якія-б моцна сталі-б за нашы інтарэсы. Няхай ня будзе нас 6, ці 8, хай будзе нас — усе 12!

Міжавец.

Ніколі не зьнішчажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаёмаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!

Карэспандэнцыі.

Як у нас пашыраецца асьвета.

У нас у в. Рымкі, Пастаўскага павету, існуе Т-ва Бел. Школы, якое змагаецца і пашырае сваю родную беларускую асьвету, а тыя перашкоды, якія на кожным кроку сустракае Т-ва, яшчэ больш загартоўваюць дух і ўзгадоўваюць цьвердых і моцных барацьбітаў за лепшую сьветлую будучыню.

Меўся ў нас адбыцца сход сябраў Т-ва Бел. Школы 11/XII с. г. у хаце гр. Сяргея Гінькі, аб чым была паведамлена Пастаўскаму Старасьце з 8/XI с. г. № 1831 пісьмом Галоўнае Управы Т-ва Бел. Школы, на што ў нас ёсьць пасьвітаваньне. Яшчэ за некалькі гадзін да сходу прыехалі да нас 2 паліцыянты і забаранілі сход, а ўсіх сябраў Т-ва з суседніх вёсак гэныя паліцыянты выгналі з нашае вёскі дамоў. А пасьля, каб нас запалохаць, пачалі хадзіць па вёсцы і пісаць пратаколы за абы-што,—навет за калдобіну на вуліцы. У выніку гэтага—штраф ад старасты па 5 зл.

Яшчэ ёсьць у нас радны Антось Гінько. Ён—сярмяжнік-беларус, але як кажуць „свая костка, але сабачым мясам абрасла. Зрабіўся гэны Гінько сэквэстратарам і жыць не дае небарачцы Ігнату Андрэйчыку за падаткі, якія, каб заплаціць іх, мусіў прадаць апошнюю кароўку.

20/XII с. г. паліцыянт № 1658 з Полаўскага пастарунку забраў у аднаго сябры Т-ва Бел. Школы Статут і Інструкцыю Т-ва Бел. Школы і гавора, каб той пашоў на пастарунак, бо кажа, што пан кіраўнік хоча „zbadać", але ён не пашоў, бо няма чаго ісьці. Т-ва Бел. Школы ёсьць легальная наша ўстанова і аб усіх спраўках можна зьвяртацца ў Галоўную Управу Т-ва, а паліцыянт і дагэтуль не няее Статуту.

Паны! ці-ж вы і дагэтуль яшчэ не зразумелі, што беларускі народ нічым ня можна запалохаць. Ніхто ня зможа зьвесьці нас з культурна-асьветнага шляху, на якім мы сьмела ідзем наперад. Няхай жыве асьвета сярод нашага сярмяжнага працоўнага люду!

Зыагар.

Чаму-ж не „алхімудрыка".

(Міжавіцкая гм. Слонімскага пав.).

Сойм з Сэнатам распушчаны. Назначаны новыя выбары. Календар выбарчы апавешчаны ўва ўсіх газэтах. Гарачыня прадвыбарнай кампаніі пачалася. Рагуля з Ярэмічам аб'ядналіся з Станкевічам, а „беларус" Умястоўскі цалуецца з вызваленцамі і інш. у „Zjednoczeniu". У беларускай вёсцы ўжо зьявіліся афішы розных польскіх партыяў, дый друкаваны яны набеларуску (знаць падлабуніваюцца пад беларускага мужычка). Там крычаць, тут чмуцяць, баламуцяць, а дзе іноў вялікія перашкоды стаўляюць. І дзіву даешся, і сьмяяцца хочацца, хаця і праз сьлёзы, і пытаеш ня раз сам сябе, дзеля чаго ў „культурнай дзяржаве" культурнікі, якія паглядаюць на Захад, гэтак нізка стаўляюць сябе, абманваючы цёмныя беларускія масы, абяцаючы і зямлю бяз выкупу, і беларускую школу, і хлеб, і волю. На мой пагляд, абманваць, крыўдзіць, шкоду якую рабіць чалавеку, гэта нізка, подла і, як кажуць у касьцеле ці царкве—грэх. Вы-ж чмуцілі і баламутнікі, напэўна, туды ходзіце. Але для вас, для вашай асабістай выгады, ня грэх, ня нізка, ня подла. Паказальнікам перашкод для сялян нашай гміны ў галасаваньні да будучага Сойму і Сэнату ёсьць вызначэньне Акружной Камісіяй выбарчых абводаў, іх месца і раcпрадзяленьне вёсак, якія куды павінны ісьці на галасаваньне. Наша гміна даволі вялікая і ўдоўжкі больш, чым ўшыркі. Акружая Камісія падзяліла гміну на дзьве роўныя часткі ўдоўжкі і назначыла абвадовыя камісіі ў двух крайніх пунктах, дзе жыве шляхта, або бліжка панскіх двароў. Гэтымі пунктамі ёсьць вёска Махнавічы і вёска Клепачы. Некаторым вёскам прыдзецца ісьці больш як за 12 вёрст, а закон кажа, што абводы не павінны быць далей, як за 5 вёрст. Вось бачыце, браточкі, якая несправядлівасьць: адны пішуць, што далей за 5 в. ня можна, а іншыя назначаюць абводы за 12 і болей вёрст. Гэта-ж і ёсьць іх усемагутная „алхімудрыка".

У канцы зварочваюся да Вас, грамада Міжавіцкае гміны, калі надойдзе час выбараў да Сойму і Сэнату, дык усе, як адзін чалавек, ня гледзячы ні на якія перашкоды, ідзеце на выбары, пакажэце ўсім і ўсяму сьвету, што мы дужыя і целам і душою, што мы пераможам усе перашкоды, выбярэм гэтакіх-жа дужых людзей да Сойму і Сэнату, дзе будуць яны бараніць нас і ўсё працоўнае сялянства ад крыўд і бясправўя.

Адно толькі, браты, не пападайцеся на вудачку розным чмуціцелям, баламутнікам. Праганяйце прэч з сваіх беларускіх працоўных вёсак, калі дзе зьявіцца гэтакі.

Міжавіцкі Кляпач.

Падзяка за бульбу.

Сьвядомасьць беларуская—гэта ня жарт, як думаюць некаторыя паны і паўпанкі. Яна пранікла ўжо ў-ва ўсе куткі гушч беларускіх і крапчэе з кожным часам. Вось факцік, які яскрава пацьвярджае гэта: у вёсцы Бусяж, Косаўскай воласьці польскі вучыцель сабраў сход сялян і намаўляў іх, каб тыя прынясьлі па кошыку бульбы камэнданту Бусяжскага пастарунка. Відаць мала тае пэнсіі, што атрымоўваюць з народнага скарбу на „панскае" жыцьцё. І хто гэта робіць? Сеяцель асьветы—вучыцель!.. Але, ні адзін селянін ня ўзмычыў „вяльможнаму пану" жаданага кошыка бульбы...

Што-ж робяць паны пасьля гэткай няўдачы—ідуць па хатах з просьбай, каб хто прадаў бульбы, і калі бульбы не знашлося і для продажы, пашлі пратаколы. Тут яны ўзяліся шчыра за спаўненьне сваіх абавязкаў.

Няма падлогі каля студні — пратакол, няма матны—пратакол, сьметнік на надвор'ку—пратакол і г. д. і г. д. Гэта падзяка сялянству за бульбу.

Грамабей.

Рэдактар-Выдавец: М. Гэрмановіч.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.